Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

16 МАЯ 2014 г. ПЯТНІЦА № 89 (27699) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА





Праграма тэлебачання на наступны тыдзень 20 КАНАЛАЎ





57 трансгранічных праектаў з еўрапейскімі суседзямі СТАР. 6





Вярнуцца да нармальнага жыцця! СТАР. 7


## БЕЛАРУСЬ ХОЧА БАЧЫЦЬ МОЦНУЮ УКРАІНУ

**Пра гэта заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Украіны ў Беларусі Міхаілам Ежалем.**

Звяртаючыся да дыпламата, Прэзідэнт адзначыў, што шмат у чым гэтая сустрэча з'яўляецца сімвалічнай. «Гэта натуральна, паколькі я вельмі шмат выказваўся з нагоды нашай Украіны, нашай уцягнутасці ў тыя працэсы, якія адбываюцца. І, напэўна, Украіне, народу і ўладам Украіны, няма ў чым мяне папракнуць. Мы імкнуліся займаць акуратную ўзважаную пазіцыю, тым не менш, адкрыта заяўляючы аб тым, што і асабіста мне, і з пункту гледжання дзяржавы нам Украіна вельмі блізкая», — адзначыў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка выказаў пажаданне, каб тыя падзеі, якія адбываюцца ва Украіне і маюць негатыўнае развіццё, хутчэй скончыліся. «Каб Украіна развівалася як адзіная цэласная дзяржава, каб гэта была наша Украіна. Ніколі мы нават не ўяўляем сабе, каб Украіна займала нейкую пазіцыю, супраціўную Беларусі, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — І я адкрыта гаварыў па пытаннях, якія нас вельмі хвалююць, у тым ліку звязаных з НАТА». Паводле слоў Прэзідэнта, няма неабходнасці ўцягваць Украіну ў нейкія блокі, уводзіць туды войскі «ні з аднаго, ні з другога, ні з трэцяга, ні з дзясятага боку».

«Украіна павінна быць Украінай. Гэта 45 млн насельніцтва, блізкі нам народ. Гэта самадастатковая краіна, і калі ёй дапамагчы, а не перашкаджаць, то гэта будзе вельмі ўплывовая краіна, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Мы хочам бачыць моцную Украіну, з якой можна супрацоўнічаць, гандляваць, як мы рабілі гэта апошнія гады, у нас быў пэўны прырост. Мы спадзяёмся, што вернемся да гэтых аб'ёмаў, і мы гатовы ў гэтым кірунку зрабіць максімум. Вы ў гэтым павінны быць упэўнены», — падкрэсліў Прэзідэнт Беларусі.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў аб сустрэчы, якая адбылася ў яго з выканаўцам абавязкаў прэзідэнта Украіны Аляксандрам Турчынавым: «Я яму адназначна, нават па-сяброўску, адказаў на многія пытанні канфідэнцыйнага характару, на яго насцярожанасць». «І я свята прытрымліваюся тых дамоўленасцяў, якія былі дасягнуты ў нас з уладамі Украіны на Прыпяці. Таму вы можаце разлічваць толькі на добрае стаўленне з боку Беларусі да Украіны і да ўсяго ўкраінскага народа, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Калі вам будзе патрэбна якая-небудзь дапамога (акрамя пасярэдніцтва — гэта выключана, я гэтага цярпець не магу), як чалавек, які вельмі блізка да сэрца ўспрымае ўсё, што адбываецца ва Украіне, я гатовы ў любы момант аказаць гэтую падтрымку і дапамогу».

У сваю чаргу Міхаіл Ежаль падзякаваў кіраўніку беларускай дзяржавы за вельмі паслядоўную і сумленную пазіцыю, паведамляе БЕЛТА. Украінскі дыпламат адзначыў, што прыкладна 5 ці 6 пазіцый, якія выказваліся Прэзідэнтам Беларусі ў інтэрв'ю тэлепраграме «Шустэр-Live», знаходзілі стапрацэнтную падтрымку аўдыторыі, якая адлюстроўвала меркаванне ўкраінскага народа ў цэлым. «Гэта бывае вельмі рэдка, каб палітыкі атрымлівалі стапрацэнтную падтрымку. Гэта аб многім гаворыць. Мы адчулі стаўленне Беларусі», — адзначыў пасол.

Міхаіл Ежаль падкрэсліў, што сустрэча Аляксандра Лукашэнкі з Аляксандрам Турчынавым дала зразумець, што народы дзвюх краін сапраўды былі, ёсць і будуць братэрскімі.

## БЮДЖЭТНЫ ВАРЫЯНТ

**Прэзідэнт даручыў прапрацаваць пытанне перадачы будынка лечкамісіі Мінску**

**Аляксандр Лукашэнка заслухаў даклад па пытанні забяспечанасці сталіцы бальнічнымі месцамі, паведамляе БЕЛТА. «Гораду патрэбна бальніца. Немалая бальніца. Я, вядома, вельмі акуратна і асцярожна стаўлюся да будаўніцтва новых бальніц, трэба было б нармальна загрузіць існуючыя, але тым не менш», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.**

У якасці аднаго з варыянтаў прапануецца разгледзець перадачу ў падпарадкаванне гарадскіх улад будынка Рэспубліканскага клінічнага медыцынскага цэнтра Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта Беларусі, размешчанага ў цэнтры Мінска, і будаўніцтва новага, больш кампактнага будынка для лечкамісіі ў прыгарадзе.

«У нас ёсць так званая прэзідэнцкая бальніца ў падпарадкаванні Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта, таму, каб не будаваць новыя бальніцы, мы маглі б гэтую махіну перадаць гораду, а пабудаваць невялікі клінічны цэнтр для выканання тых функцый, якія сёння выконвае бальніца пры Кіраўніцтве справамі Прэзідэнта», — сказаў Аляксандр Лукашэнка, звярнуўшы ўвагу на тое, што падобны варыянт запатрабуе меншых фінансавых выдаткаў: «Гэта было б нашмат танней для краіны: мы аддаём Ладуцьку (мэр Мінска. — Заўвага БЕЛТА ) гэтую бальніцу, а замест яе, каб горад не марнаваў $500 млн на будаўніцтва новай бальніцы, маглі б у пяць разоў танней пабудаваць невялікі кампактны цэнтр».

Прэзідэнт запатрабаваў далажыць аб прапрацоўцы гэтага пытання, цане будаўніцтва, а таксама месцы, забудоўшчыку і тэрмінах.

Па выніках даклада Аляксандр Лукашэнка даручыў дэталёва пралічыць прапановы і ўнесці на яго разгляд найбольш аптымальны варыянт.

■ Служу Айчыне

## ДОБРАЙ ДАРОГІ, ПРЫЗЫЎНІК!





**15 мая распачалася адпраўка прызыўнікоў на тэрміновую службу ў войска. Каля сотні будучых вайскоўцаў, ураджэнцаў Міншчыны, наказ на добрую службу атрымалі на мемарыяльным комплексе «Курган Славы» і адправіліся ў свае воінскія часці.**

Агулам на ўкамплектаванне Узброеных Сіл плануецца накіраваць каля 9 тысяч чалавек. Як прызнаўся **Сяргей КУПРЫК, генерал-маёр, намеснік начальніка Генеральнага штаба Узброеных Сіл,** працэнт годнасці для прахождання службы даволі высокі.

— Усяго сёлета на мерапрыемствы прызыву запрашалася 71 тысяча чалавек. Больш за 26 тысяч грамадзян атрымалі адтэрміноўкі па пэўных прычынах, большую частку з якіх складаюць адтэрміноўкі для працягнення вучобы. Адпраўка пачалася з усіх абласных зборных пунктаў і горада Мінска.

**Тарас ШЧЫРЫ. Фота аўтара.**

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Алег КАРАЗЕЙ, начальнік упраўлення прафілактыкі МУС:**

***«Міністэрства ўнутраных спраў ініцыявала змены ў закон аб абароце спіртазмяшчальнай вадкасці ў частцы абмежавання часу продажу спіртнога з 22.00 да 9.00, а таксама ўзросту, з якога можна набываць спіртное, — з 21 года. У Беларусі кожнае дзясятае злачынства здзяйсняецца маладымі людзьмі да 21 года. Для іх алкаголь з'яўляецца своеасаблівым каталізатарам. Законапраект прайшоў узгадненне з усімі зацікаўленымі ў Савеце Міністраў. У хуткім часе яго павінны прадставіць у Палаце прадстаўнікоў. Мяркуецца, што гэтая норма можа ўступіць у сілу з 2015 года».***

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 16.05.2014 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 10020,00 | ▲ |
| Еўра | 13720,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 289,00 | ▲ |
| Укр. грыўня | 845,57 | ▼ |

■ Узровень

## РАСЦІ ЗДАРОВЫМ, МАЛЫ!

**У Магілёве хутка пачнуць рабіць дзецям усе віды хірургічных аперацый**



Генадзь Вайцяховіч у «святая святых» хірургічнага корпуса — аперацыйным блоку.

**Маленькай Настачцы яшчэ 4 месяцы, і большую частку свайго жыцця яна са сваёй мамай Юляй знаходзіцца ў бальніцы. У дзяўчынкі інфекцыя выклікала закупорванне жоўцевых шляхоў, і, каб пазбавіцца ад усіх непрыемных наступстваў, трэба прайсці працяглы курс лячэння. Апошняе маму не пужае. Галоўнае, каб дзіця паправілася.**

— Да абласной дзіцячай бальніцы мы паспелі пабываць у Бараўлянах, мінскім дзіцячым хірургічным цэнтры, інфекцыйным шпіталі, — пералічвае Юлія свае блуканні па лячэбных установах. — Да нашай медыцыны ў мяне няма ніякіх прэтэнзій: усё, што трэба для лячэння, нам прадастаўляюць. Умовы таксама добрыя. Нават пасцельныя рэчы мяняюць не згодна з графікам, а раней — калі ёсць такая неабходнасць. Няма пытанняў і па харчаванні: меню паўтараецца толькі праз 2 тыдні. І, што вельмі важна, усё паслугі бясплатныя.


СТАР. 2


■ Здымнае жыллё

## КВАТЭР ШМАТ, А ПОПЫТ НА ІХ — НУЛЯВЫ

**Эксперты сталічнага рынку арэнды прагназуюць, што ўжо ў ліпені арэнднае жыллё можа патаннець мінімум на 30%**

**Пяць месяцаў запар на мінскім рынку жыллёвай нерухомасці назіраецца сапраўдны «мёртвы» сезон, калі колькасць здзелак куплі-продажу кватэр паменшылася ў разы. Больш за тое, працяглы сезон мінімальнай актыўнасці патэнцыяльных пакупнікоў сур'ёзна «зачапіў» прыватны сектар здымнага жылля. Пра сённяшнюю сітуацыю на сталічным рынку арэнды і прагнозы на бліжэйшую перспектыву карэспандэнту «Звязды» паведаміла намеснік генеральнага дырэктара Цэнтра гандлю нерухомасцю «ПАКАДАН» Аксана ЛУКАШЭВІЧ.**

### ВЫБАР СЯРОД СОЦЕНЬ ВАРЫЯНТАЎ

Летась увесну прыватнага арэнднага жылля катастрафічна не хапала, пасля чаго цэны на здымныя кватэры істотна павялічыліся. Цяпер сітуацыя цалкам змянілася, бо з рынку знікла вялікая колькасць кліентаў, якія былі гатовы плаціць за арэндныя кватэры амаль любыя грошы. Сёння попыт паменшыўся ў разы, і адначасова сур'ёзна павялічылася прапанова даволі якасных жылых памяшканняў. Асобныя гаспадары пустых кватэр дагэтуль крыху прытрымлівалі здачу свайго жылля, каб падчас чэмпіянату свету па хакеі атрымаць ад замежных турыстаў вялікі куш. Не атрымалася.


СТАР. 2


■ Надвор'е

## НА НАСТУПНЫМ ТЫДНІ ДА +32

**Напрыканцы тыдня чакаецца пагаршэнне надвор'я, калі на тэрыторыю нашай краіны завітае балтыйскі цыклон. Ён прынясе да нас дажджы, але цяплее, паведаміла рэдакцыі спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга ФЯДОТАВА.**

У выхадныя на ўсёй тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы і навальніцы, а ў нядзелю дажджы месцамі будуць сапраўды моцнымі. Тэмпература ўначы на суботу — плюс 10-16, удзень — 21-28 цяпла, па паўднёвым захадзе плюс 17-20 градусаў. Уначы на нядзелю 11-18, удзень — плюс 21—28, а па крайніх паўночна-ўсходніх раёнах да 30 цяпла.

На наступным тыдні з панядзелка па сераду месцамі будуць ісці кароткачасовыя дажджы і навальніцы. Уначы будзе плюс 12-18 градусаў, удзень — 22-29, а па ўсходзе краіны месцамі прыпячэ да 30-32 цяпла. Да нас завітае лета ў маі...

**Сяргей КУРКАЧ.**

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### ПА ТУРЦЫІ ПРАКАЦІЛАСЯ ХВАЛЯ ЗАБАСТОВАК З-ЗА АВАРЫІ НА ШАХЦЕ



У сувязі з гібеллю 282 чалавек на шахце Сома ў турэцкай правінцыі Маніса, у чацвер працягваліся масавыя пратэсты супраць дрэнных умоў бяспекі працы ў горназдабыўнай прамысловасці. Па закліку найбуйнейшых прафсаюзаў краіны сотні тысяч людзей выйшлі на акцыі пратэсту ў Стамбуле, Анкары і іншых гарадах, перадае CTVNews. У сераду вартавыя парадку разагналі мітынгі ў Соме, Стамбуле і Анкары. У чацвер у Ізміры, дзе сабралася каля 20 тысяч актывістаў прафсаюзнага руху, паліцыя выкарыстала слёзісты газ і вадамёты. Паводле звестак газеты Hurriyet, лідар Канфедэрацыі прафсаюзаў рабочых-рэвалюцыянераў Кані Беко, які ўдзельнічаў у шэсці, шпіталізаваны. Тым часам працягвалася выратавальная аперацыя. У падземнай пастцы заставаліся 100 шахцёраў. Работы ўскладняла моцнае задымленне і пажар, які так і не ўдалося лакалізаваць.

### ЛАТВІЙСКІ МЭР ЗАПАТРАБАВАЎ ПРАБАЧЭННЯЎ АД НАТА

Мэр латвійскага партовага горада Вентспілса Айварс Лембергс запатрабаваў прабачэнняў ад генеральнага сакратара НАТА Андэрса Фога Расмусэна за непрыстойныя паводзіны маракоў краін альянсу, якія ўдзельнічаюць у ваенных вучэннях Open Spirit 2014. Лембергс накіраваў ліст Расмусену, у якім паведаміў, што маракі п'янымі ўвязваюцца ў бойкі з жыхарамі Вентспілса. «Беручы пад увагу паводзіны ваенных НАТА, немагчыма прагназаваць, якія пагрозы яны нясуць жыхарам горада. Невядома, на што яны здольныя, будучы ў такім моцным алкагольным ап'яненні і маючы на караблі такую магутную ваенную тэхніку і ўзбраенне», — гаварылася ў пісьме. Аналагічныя лісты Лембергс накіраваў кіраўніку латвійскага МЗС і міністру абароны рэспублікі.

### АКРЭСЛЕНАЯ МЭТА ДАПАМАГАЕ ДАЎЖЭЙ ПРАЖЫЦЬ

На думку псіхолагаў, даўгалецце даступнае людзям, якія маюць мэту ў жыцці і нейкі занятак. Калі ж існаванне бязмэтнае, чалавек ідзе на пенсію і нічым не займаецца, то яму наўрад ці ўдасца пражыць доўга, піша The Daily Mail. Такім чынам, тэорыя наступная: людзі, якія маюць мэты ў жыцці ў сярэднім узросце, часцей выбіраюць здаровы лад жыцця, каб выканаць пастаўленыя задачы. І чым раней будуць пастаўлены мэты, тым большая верагоднасць пераходу на здаровы лад жыцця ў маладым узросце. Гэта паказвае працяглае назіранне за 6000 амерыканцаў. У самым пачатку даследавання людзей апытвалі на прадмет мэты ў жыцці. Праз 14 гадоў 9% апытаных памерлі. І часцей за ўсё гэта былі людзі, якія не мелі мэты, скардзіліся на негатыўныя эмоцыі і адносіны. Не дзіўна, што, страціўшы пасля сыходу на пенсію занятак, які арганізуе ўсё жыццё, пажылы чалавек пачынае адчуваць сябе дрэнна. Аднак, падкрэсліваюць навукоўцы, мэту ў жыцці важна знайсці не толькі пажылым, але і маладым людзям.


ISSN 1990 - 763X


ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### САЦЫЁЛАГІ: ПАРАШЭНКА МАЕ ШАНЦ СТАЦЬ ПРЭЗІДЭНТАМ У ПЕРШЫМ ТУРЫ

Калі б прэзідэнцкія выбары адбываліся сёння, а не 25 мая, то 33,7 працэнта насельніцтва Украіны прагаласавалі б за Пятра Парашэнку. Пра гэта сведчаць вынікі апытання, праведзенага Кіеўскім міжнародным інстытутам сацыялогіі. За экс-прэм'ера Юлію Цімашэнка свае галасы гатовыя



аддаць 5,9 працэнта выбаршчыкаў, за экс-міністра сацыяльнай палітыкі Сяргея Цігіпку — 4,1 працэнта. 13 працэнтаў апытаных вырашылі не прымаць удзел у галасаванні, а 25,4 працэнта пакуль не вызначыліся, за каго галасаваць. Прыхільнікаў Парашэнкі больш за ўсё на захадзе краіны — 53 працэнты сярод усіх апытаных. Менш за ўсё — на ўсходзе, толькі 10,5 працэнта. За Цімашэнку на захадзе гатовыя галасаваць 7,9 працэнта рэспандэнтаў, а на ўсходзе крыху больш за адзін працэнт.

КОРАТКА

Беларусь і Знешэканамбанк падпісалі дагавор па крэдыце да $500 млн тэрмінам да 8 гадоў (4 з якіх — гэта льготны перыяд) для фінансавання авансавых плацяжоў па генеральным кантракце на ўзвядзенне Беларускай АЭС.

Былы намеснік старшыні канцэрна «Белнафтахім» Уладзімір Волкаў прыгавораны да васьмі гадоў пазбаўлення волі ў калоніі ўзмоцненага рэжыму з канфіскацыяй маёмасці.

Беларуская чыгунка з 15 мая пачала продаж білетаў за 60 сутак да адпраўлення на цягнікі нумар 1/2 Масква — Мінск, нумар 3/4 Масква — Брэст, нумар 7/8 Масква — Брэст, нумар 11/12 Масква — Мінск, нумар 39/40 Масква — Полацк, нумар 51/52 Санкт-Пецярбург — Мінск, нумар 55/56 Масква — Гомель.

Сталічныя музеі 18 мая будуць працаваць бясплатна. Такі падарунак мінчанам і турыстам вырашана зрабіць з нагоды Міжнароднага дня музеяў, які прыпадае на бліжэйшую нядзелю.

Пасля таго, як міжнародныя плацежныя сістэмы Visa і MasterCard перасталі праводзіць аперацыі для кліентаў шэрага расійскіх банкаў, інтарэс да плацежнай сістэмы БЕЛКАРТ узрос.

■ Я зноў выбіраю «Звязду»

## «ГАЗЕТУ ЧЫТАЮЦЬ У КОЖНЫМ СЕЛЬСАВЕЦЕ»



Фота Надзеі БУЖАН.

**Святлана ГЕРАСІМОВІЧ, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні:**

— Сёння «Звязда» — адзіная газета, якая мае адмысловую ўкладку, прысвечаную мясцоваму самакіраванню. Я шмат езджу па рэгіёнах, сустракаюся з дэпутатамі і ведаю, што яе чытаюць у кожным сельскім Савеце. Дэпутатам падабаецца гэтая газета, у тым ліку і таму, што практычна ўсе публікацыі, прысвечаныя рэгіёну, з'яўляюцца «настольнымі». Я таксама з задавальненнем выпісваю і чытаю «Звязду». Накіраванасць гэтай газеты вельмі актуальная таму, што яна закранае ўсе бакі жыцця звычайнага чалавека. А «Мясцовае самакіраванне» наогул ад першай да апошняй літары прачытваю. Вельмі ўдзячна супрацоўнікам газеты, якія дабіраюцца нават да самых далёкіх куткоў Беларусі, расказваюць пра нашых дэпутатаў, старастаў, неабыякавых жыхароў вёсак і гарадоў. Асаблівай увагі заслугоўваюць матэрыялы аб моладзі. І кожны артыкул, які выходзіць пра іх справы, — гэта без перабольшвання маральная ўзнагарода, своеасаблівая ацэнка іх працы. «Мясцовае самакіраванне» спрыяе распаўсюджанню вопыту работы органаў уласна мясцовага самакіравання: не трэба ніякіх брашур выдаваць, усю актуальную інфармацыю можна знайсці ў «Звяздзе». Мы са старшынямі абласных, раённых і сельскіх Саветаў часта абмяркоўваем публікацыі газеты на Савеце па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання, якія створаны пры Савеце Рэспублікі. Лічу, што «Мясцовае самакіраванне» — гэта вельмі патрэбная ўкладка, таму яе трэба і далей развіваць і ўмацоўваць.

**Запісала Надзея ДРЫЛА.**


*Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе. Заставайцеся з намі — мы пішам пра тое, што сапраўды важна!*

■ Пазіцыя ў свеце

# ВЫБАРЫ ЯК СУВЕРЭННАЕ ПРАВА НАРОДА

**Самастойнае вызначэнне далейшага напрамку свайго развіцця — неад'емнае, суверэннае права ўкраінскага народа. Такую пазіцыю Міністэрства замежных спраў агучыў на чарговым брыфінгу прэс-сакратар гэтага ведамства Дзмітрый МІРОНЧЫК, адказваючы на пытанне аб маючых адбыцца 25 мая прэзідэнцкіх выбарах у суседняй дзяржаве.**

## РАШЭННЕ КАНФЛІКТУ — У ДЫЯЛОГУ

— Выбары — гэта найлепшая, найбольш прымальная і дэмакратычная форма рэалізацыі такога права, — заявіў Дзмітрый Міронччык. — Лічу, што ў той сітуацыі, якая склалася, Украіне крайне неабходна стабільная ўлада, легітымнасць якой будзе базавацца на выніках выбараў. Разам з тым важна, каб магчымасць для свабоднага волевыяўлення мелі грамадзяне ўсіх рэгіёнаў краіны.

Па інфармацыі МЗС, прадстаўнікі Рэспублікі Беларусь прымуць удзел у назіранні за выбарамі ва Украіне.

Каментуючы сітуацыю на паўднёвым усходзе суседняй дзяржавы і рэферэндум, які 11 мая прайшоў у Данецкай і Луганскай абласцях, Дзмітрый Міронччык падкрэсліў, што пазіцыя Беларусі па пытанні федэралізацыі Украіны была выказана кіраўніком нашай дзяржавы даўно і яна застаецца нязменнай.

— Мы неаднаразова звярталіся з заклікам да ўсіх бакоў украінскага канфлікту ў поўнай ступені ўсвядоміць сваю адказнасць за будучыню Украіны і неадкладна сесці за стол перамоў, — заўважыў дыпламат. — Рашэнне гэтага канфлікту павінна базавацца на аб'яднальных, а не раз'яднальных пачатках, і яго неабходна шукаць, у першую чаргу ў рамках шырокага агульнанацыянальнага дыялогу, у якім былі б прадстаўлены інтарэсы ўсіх сіл, што знаходзяцца па розныя бакі барыкад.

Што да цяперашніх стасункаў Беларусі і Украіны, то, як паведаміў прэс-сакратар знешнепалітычнага ведамства, сёння кантакты паміж Кіевам і Мінскам здзяйсняюцца на ўсіх узроўнях, неабходных для падтрымання адносін паміж дзвюма суседнімі сяброўскімі краінамі.

## КАЛІ ВІЗЫ СТАНУЦЬ НЕПАТРЭБНЫМІ?

Дзмітрый Міронччык паведаміў журналістам, што гэтымі днямі ў Вене з удзелам беларускіх дыпламатаў праходзіць «круглы стол» па трансгранічнай мабільнасці і спрашчэнні візавых працэдур, арганізаваны Бюро па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека (БДІПЧ) Арганізацыі па бяспецы Савета Еўропы. Мэта мерапрыемства — прэзентацыя БДІПЧ высноў і рэкамендацый на падставе праведзенага даследавання па трансгранічнай мабільнасці.

— Расцэньваючы свабоду перамяшчэння як адну з асноватворных свабод, найважнейшы складнік чалавечага вымярэння АБСЕ, Беларусь выступае за неабходнасць максімальнага спрашчэння візавага рэжыму на прасторы арганізацыі, — заявіў Дзмітрый Міронччык. — Пры гэтым мы сыходзім з таго, што краіны-члены ўжо заклалі ў базавы дакумент АБСЕ аснову для дасягнення гэтай мэты.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** ■

■ «Залатыя рукі»

# ПРАФЕСІЙНЫ АЛІМП ЧАКАЕ СВАІХ ГЕРОЯЎ

**«У апошняе дзесяцігоддзе ў нашай краіне прасочваюцца дзве выразныя тэндэнцыі: з аднаго боку, расце прэстыж і даступнасць вышэйшай адукацыі, а з другога — зніжаецца цікавасць з боку моладзі да прафесійнай адукацыі. Адначасова з гэтым на рынку працы адчуваецца востры дэфіцыт менавіта кваліфікаваных рабочых і спецыялістаў», — заявіў падчас правядзення ў БЕЛТА «круглага стала» намеснік міністра адукацыі Віктар ЯКЖЫК.**



20—22 мая ў Беларусі пройдзе першы рэспубліканскі конкурс прафесійнага майстэрства WorldSkills Belarus—2014. Нядаўна Беларусь далучылася да міжнароднай арганізацыі WorldSkills International (WSI), якая займаецца папулярызацыяй працоўных прафесій, у тым ліку праз правядзенне міжнародных спаборніцтваў. Першы нацыянальны чэмпіянат абяцае стаць змястоўным і надзвычай відовішчным, цікавым для самай шырокай аўдыторыі, у асаблівасці для тых, каму ў бліжэйшы час давядзецца зрабіць свой прафесійны выбар. Падчас спаборніцтваў можна будзе пазнаёміцца са зместам дзясяткаў прафесій і нават паспрабаваць свае сілы ў тым ці іншым рамястве. Гэта будзе сапраўднае свята прафесійнай адукацыі з прэзентацыяй калекцый «Млына моды», выступленнямі маладзёжных музычных калектываў і агітбрыгад, а таксама з «Горадам майстроў», дзе будзе прадстаўлена творчасць навучэнцаў прафтэхустаноў і арганізаваны майстар-класы для ўсіх ахвотных...

Непасрэдна ў спаборніцтвах удзел возьмуць амаль 150 прадстаўнікоў навучальных устаноў прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі. Канкурсанты будуць дэманстраваць свае прафесійныя навыкі па 20 спецыяльнасцях: ад кандытарскага майстэрства, дызайну адзення і рэстараннага сэрвісу — да зварачных, сталярных работ і мабільнай робататэхнікі. Удзельнікам будзе прадастаўлена самае сучаснае абсталяванне з лічбавым праграмным кіраваннем вядомых сусветных фірмаў. Рэгламент правядзення спаборніцтваў, змест конкурсных заданняў, крытэрыі ацэньвання, пералік неабходных матэрыялаў, інструментаў і абсталявання, патрэбнага для забеспячэння працоўнага месца, знаходзяцца ў адкрытым доступе на спецыяльна створаным сайце WorldSkills Belarus.

Як падкрэсліў Віктар Якжык, для Міністэрства адукацыі надзвычай важна, што непасрэднымі ўдзельнікамі мерапрыемстваў рэспубліканскага конкурсу стануць прадстаўнікі бізнесу і дзяржаўнага сектара эканомікі, якія павінны дапамагчы знайсці канкрэтныя адказы на выклікі часу. У ролі экспертаў на спаборніцтвах выступяць прадстаўнікі прадпрыемстваў і арганізацый розных галін эканомікі, якія, як ніхто іншы, змогуць ацаніць ступень прафесійнай падрыхтоўкі канкурсантаў, узровень іх далейшай адаптаванасці да ўмоў вытворчасці і ўвогуле практыка-арыентаванасць прафесійнай адукацыі: «Нам важна зразумець, якія асноўныя ўменні і навыкі павінны суправаджаць выпускніка, каб ён мог уключацца ў вытворчы працэс неадкладна», — дадаў Віктар Якжык.

— Беларусь не толькі захавала сістэму прафесійнай адукацыі, але і развіла яе. Аднак сёння перад намі стаяць іншыя задачы, — падзяліўся сваёй думкай **рэктар Рэспубліканскага інстытута прафесійнай адукацыі, доктар педагагічных навук, прафесар Аркадзь ШКЛЯР.** — Мы паспяхова рыхтуем спецыялістаў для масавай вытворчасці, але сёння, калі функцыі работнікаў вытворчасці змяніліся і праца стала рабатызаванай, мы павінны вучыцца рыхтаваць спецыялістаў з прыцягненнем сучасных інфармацыйных тэхналогій.

— Установы адукацыі павінны рабіць акцэнт на практычных занятках. Вельмі важна, каб у сферы прафесійнай адукацыі не было гонкі за тэорыяй , — лічыць **намеснік міністра гандлю Ірына НАРКЕВІЧ.** — Практыка і тэорыя павінны ісці разам, у тым ліку трэба ўключаць ва ўсе вучэбныя праграмы як мага больш розных майстар-класаў. Асабліва гэта тычыцца навучання па спецыяльнасцях, дзе трэба шмат працаваць рукамі, напрыклад, пры падрыхтоўцы будучых цырульнікаў. Пад установы адукацыі ў краіне адводзяцца новыя сучасныя будынкі, і гэта цудоўна, але нельга аснасціць навучальную ўстанову абсталяваннем адзін раз і назаўсёды. Трэба пастаянна адаптаваць і абнаўляць матэрыяльна-тэхнічную базу, не даваць ёй маральна і фізічна зношвацца.

У той жа час на беларускіх прадпрыемствах усё часцей сталі з'яўляцца ўласныя вучэбныя цэнтры, бо менавіта там маецца самае сучаснае абсталяванне, на якім і давядзецца працаваць цяперашнім навучэнцам. «Міністэрства гандлю робіць усё для таго, каб беларускія спецыялісты былі добра падрыхтаваны», — падкрэсліла Ірына Наркевіч. Для гэтага пастаянна арганізуюцца майстар-класы, чэмпіянаты, спаборніцтвы сярод прафесіяналаў. На такія мерапрыемствы запрашаюцца абавязкова студэнты і навучэнцы. Для іх гэта ўнікальная магчымасць паназіраць за работай майстроў, чамусьці ў іх навучыцца. Чым больш будзе мерапрыемстваў па профілі, якія будуць наведваць выкладчыкі, студэнты, навучэнцы і прафесіяналы-практыкі, тым лепш.

Плануецца, што першы нацыянальны чэмпіянат па прафесійным майстэрстве наведаюць і сотні гасцей з ліку ўдзельнікаў чэмпіянату свету па хакеі.

***Для даведкі:*** *першы чэмпіянат WorldSkills прайшоў у Мадрыдзе ў 1950 годзе. Апошнія міжнародныя спаборніцтвы праводзіліся ў Лейпцыгу летась і сабралі 200 тысяч гледачоў, расцягнуўшыся ажно на чатыры дні. Абсалютны лідар WSI шасці апошніх чэмпіянатаў — Карэя. У 2015 годзе ўдзел у міжнародных спаборніцтвах упершыню возьмуць і беларусы.*

**Надзея НІКАЛАЕВА** ■

НАВІНЫ

## У СТАЛІЧНЫХ УНІВЕРМАГАХ — ДНІ ЗНІЖАК

**Адзіныя дні зніжак пройдуць у сталічных універмагах 17 і 18 мая. У акцыі возьмуць удзел ГУМ, ЦУМ, ГД «На Нямізе», «Беларусь».**

Як паведамілі ў галоўным упраўленні спажывецкага рынку Мінгарвыканкама, ГУМ возьме ўдзел у гарадской акцыі «20:0 на карысць пакупніка». Зніжка ў памеры 20 працэнтаў будзе распаўсюджвацца на ўвесь асартымент нехарчовых тавараў. ЦУМ прадаставіць пакупнікам зніжку ў 15 працэнтаў ад рознічнай цаны на абуткова-галантарэйныя, швейна-трыкатажныя і парфюмерна-касметычныя тавары. «Гандлёвы дом «На Нямізе» правядзе фестываль-кірмаш тавараў са зніжкай у 15 працэнтаў. Яна будзе распаўсюджвацца на ўсе нехарчовыя тавары і многія харчовыя тавары ва ўніверсаме, універмагу і краме па вуліцы А.Кашавога, 14. Універмаг «Беларусь» дасць пакупнікам зніжку ў 15 працэнтаў на ўсе тавары коштам больш за 10 тысяч рублёў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## ДЗЯРЖАВА ПАДТРЫМАЕ ТЫХ, ХТО ЎСЫНАВІЦЬ ДЗЯЦЕЙ, СТАРЭЙШЫХ ЗА 3 ГАДЫ

**У Беларусі можа быць прынята рашэнне аб тым, каб жанчынам, якія ўсынавілі дзіця, старэйшае за тры гады, прадастаўляць дэкрэтны водпуск.**

На сённяшні дзень у нашай краіне падлягаюць усынаўленню больш за 13 тысяч дзяцей, з якіх 4 тысячы знаходзяцца ў дзіцячых інтэрнатах і каля 9 тысяч — у апякунскіх нярodных сем'ях.

Як паведаміла **дырэктар Нацыянальнага цэнтра ўсынаўлення Міністэрства адукацыі Наталля ПАСПЕЛАВА,** амаль 40% дзяцей, якія ідуць на ўсынаўленне, — старэйшыя за 3-гадовы ўзрост. І галоўнай задачай устаноў і спецыялістаў, якія займаюцца працэсам усынаўлення, па словах Наталлі Паспелавай, з'яўляецца падрыхтоўка і пераарыентацыя беларускіх сем'яў на ўсынаўленне дзяцей старэйшага ўзросту. Пры гэтым яна падкрэсліла, што гэты працэс не можа ажыццяўляцца без дзяржаўнай падтрымкі. У прыватнасці, у Беларусі можа быць прынята рашэнне аб тым, каб жанчынам, якія ўсынавілі дзіця, старэйшае за тры гады, прадастаўляць дэкрэтны водпуск. Як патлумачыла дырэктар Нацыянальнага цэнтра ўсынаўлення, такі захад дапаможа прыёмным бацькам зрабіць выбар на карысць дзяцей старэйшага ўзросту.

**ДА ВЕДАМА**

✓*У Беларусі выкарыстоўваюць некалькі формаў сямейнага ўладкавання дзяцей сірочай катэгорыі: усынаўленне, апека (папячыцельства), прыёмная сям'я як прафесійная форма клопату і патранатнае выхаванне.*

✓*Кожны год у рэспубліцы ўсынаўляецца больш за 500 дзяцей, летась беларускія сем'і ўсынавілі 551 дзіця, 8 дзяцей былі ўсыноўлены грамадзянамі Італіі.*

✓*За апошнія 10 гадоў колькасць немаўлят-адмоўнікаў у Беларусі скарацілася ў 4 разы. Так, у 2003 годзе біялагічныя маці адмовіліся ад 452 немаўлят, а ў 2013-м — ад 107-і.*

**Вольга ВАСІЛЬЕВА.**

ПАДЗЕІ

## «ЛЕПШЫ МЕНЕДЖАР ПА ЯКАСЦІ»

**Дзяржаўны камітэт па стандартызацыі аб'яўляе чарговы, дзявяты конкурс «Лепшы менеджар па якасці».**

Конкурс праводзіцца для менеджараў па якасці ў намінацыях у залежнасці ад кірунку дзейнасці арганізацыі і колькасці яе работнікаў: арганізацыі сферы вытворчасці да 500 чалавек; ад 500 да 1000 чалавек; ад 1000 да 5000 чалавек; а таксама арганізацыі сферы паслуг да 100 чалавек і больш за 100 чалавек.

Прыняць удзел у ім могуць спецыялісты або кіраўнікі службаў сістэмы менеджменту арганізацый Беларусі ўсіх формаў уласнасці, якія займаюцца гэтым у сваёй арганізацыі не менш за тры гады. Абавязковая ўмова — наяўнасць сертыфікаванай сістэмы якасці ў арганізацыі, якую прадстаўляе ўдзельнік. Паўторны ўдзел у конкурсе дапускаецца не раней чым праз тры гады.

Арганізацыя, якая прадстаўляе сваіх менеджараў па якасці для ўдзелу ў конкурсе, павінна падаць у сакратарыят конкурснай камісіі заяўку і камплект устаноўленых дакументаў да 1 верасня 2014 года.

Ацэнка матэрыялаў будзе праводзіцца конкурснай камісіяй па наступных крытэрыях: практычныя вынікі функцыянавання сістэмы менеджменту якасці; асабісты ўклад удзельніка конкурсу ў яе распрацоўку, укараненне і ўдасканаленне і інш.

Звесткі аб пераможцах будуць апублікаваны ў СМІ і размешчаны на сайтах Дзяржстандарта і БелДІСС.

**Кантакты сакратарыята конкурснай камісіі:**

220113, г. Мінск, вул. Мележа, 3, к.805. Тэл. ( 017 ) 262 52 54, Факс ( 017 ) 262 12 64, e — mail: ntc@belgiss.by

ФАКТЫ

## ЗА СТОЛ, ДЗЕ АБРУС — ЗЯЛЁНАЯ ТРАВА

**Адправіць сябрам унікальную эка-паштоўку проста з гарадской плошчы, пачаставацца вегетарыянскімі ласункамі, даведацца больш пра ўнікальныя прыродныя мясціны Беларусі прапануюць мінчанам і гасцям горада, якія прыехалі на чэмпіянат свету па хакеі, удзельнікі экалагічнага таварыства «Зялёная сетка». Яны будуць чакаць усіх ахвотных на пешаходнай частцы плошчы Свабоды 17 мая з 13 да 18 гадзін.**



Чым адрозніваецца зубр ад бізона? Куды адлятаюць на зіму адагрэцца самыя пераборлівыя птушкі Беларусі? Якое паходжанне мае слова «пушча»? Актывісты «Зялёнай сеткі» вырашылі дапамагчы такім чынам даведацца больш пра нашу краіну і яе ўнікальную прыроду: цікавыя факты змешчаны ў эка-паштоўках, якія можна будзе падпісаць і адправіць сябрам па Беларусі і за яе межы. Таксама для мінчан і гасцей сталіцы арганізатары падрыхтавалі памяткі пра тое, як з карысцю адпачыць у нашай краіне.

А гурманаў чакае сюрпрыз ад павароў-вегетарыянцаў, якія збіраюцца здзівіць смачнымі і карыснымі ласункамі і печывам з натуральных прадуктаў. Ахвотным паспытаць гэтыя прысмакі трэба арыентавацца на арт-аб'ект у выглядзе стала з сапраўднай зялёнай травой замест абруса.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# РАСЦІ ЗДАРОВЫМ, МАЛЫ!



Юлія з маленькай Настачкай спадзяюцца на айчынную медыцыну.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

У палаце, дзе ляжаць Юля з дачкой, ёсць усе выгоды: душ, санвузел. Тое, што побач з гэтым корпусам знаходзіцца яшчэ адзін — хірургічны, з сучасным медыцынскім абсталяваннем, які хутка прыме маленькіх пацыентаў, яна таксама ведае. Для такіх, як яна матуль, гэта вельмі важная навіна. Жанчына чула, што тэхніка там «на мяжы фантастыкі», а галоўнае — усе спецыялісты і службы будуць сабраны ў адным месцы.

Сучасны хірургічны корпус амаль на 200 месцаў, які аб'яднае пад адным дахам усе дзіцячыя ложкі, уступіць у строй у наступным месяцы. Пакуль дзеці знаходзяцца ў розных «дарослых» бальніцах Магілёва. Калісьці такая сістэма лячэння лічылася правільнай, але цяпер, калі з'явіліся новыя патрабаванні і новыя тэхналогіі, яна зжыла сябе. Адкрыццё перадавога ў любым сэнсе корпуса дасць магчымасць выйсці на новы ўзровень медабслугоўвання.

— Сярэдні ўзрост нашых аддзяленняў сёння складае 40 гадоў. За гэты час з'явіліся новыя кадры, змянілася дыягностыка. Таму ў свой час узнікла ідэя сканцэнтраваць усё ў адным месцы. Бацькі змогуць прыехаць сюды з хворым дзіцем і разам вырашыць усе праблемы, — кажа галоўны ўрач абласной дзіцячай бальніцы Ігар Каско.

Дарэчы, на дапаўненне корпуса Міністэрства аховы здароўя краіны толькі ў гэтым годзе накіроўвае каля 24-26 мільярдаў рублёў.

— За апошнія некалькі гадоў у сістэме аховы здароўя краіны адбыліся значныя перамены — лічыць Ігар Каско. — Пасля маштабнага пераасначшэння вядучыя рэспубліканскія навукова-практычныя медыцынскія цэнтры кардыялогіі, неўралогіі і нейрахірургіі, трансплантацыі органаў і тканак чалавека, дзіцячы онкагематалагічны цэнтр, асноўныя клінічныя стацыянары па ўзроўні не ўступаюць вядучым замежным клінікам. А ў шэрагу момантаў — напрыклад, па пытаннях анкалагічных захворванняў, трансплантацыі органаў і тканак чалавека — нават пераўзыходзяць аналагічныя сусветныя цэнтры. Сёння няма захворванняў, якія беларускія медыкі не змаглі б вылечыць. Раней, калі шэраг складаных парокаў сэрца ў рэспубліцы не аперыраваўся, прыходзілася везці дзіця ў Маскву ці ў Кракаў. Былі складанасці і з фінансаваннем, і з дастаўкай. Мы адпраўлялі сваю рэанімацыйную брыгаду і везлі «цяжкае» дзіця на штучнай вентыляцыі лёгкіх да мяжы, а там перадавалі польскай брыгадзе... Бывала, што пры гэтым маленькі пацыент гінуў. Цяпер такога няма наогул.

Калі рабілася пераабсталяванне медыцынскіх устаноў краіны, толькі рэанімабіляў было набыта больш за 160. У Магілёўскай вобласці, напрыклад, кругласутачна працуюць 3 дзіцячыя і 2 дарослыя рэанімацыйныя машыны, абсталяваныя па апошнім слове тэхнікі. Асабліва цяжкія пацыенты паступаюць з раёнаў у абласныя клінікі, дзе больш высокі ўзровень медыцынскай дапамогі. Усе гэтыя змены дазволілі знізіць дзіцячую смяротнасць. За 4 сёлетнія месяцы на Магілёўшчыне яна склала ўсяго 2,5 праміле. Рэгіён можна ставіць на 1 месца ва ўсім свеце па нізкім узроўні дзіцячай смяротнасці.

**Раней, калі шэраг складаных парокаў сэрца ў рэспубліцы не аперыраваўся, прыходзілася везці дзіця ў Маскву ці ў Кракаў. Былі складанасці і з фінансаваннем, і з дастаўкай.**

З пачатку 2000-х магілёўскія медыкі аказваюць дапамогу неданошаным дзецям, вага якіх складае ўсяго 500 грамаў. Раней немаўлят менш за кілаграм нават на выходжвалі — не было такой магчымасці. Сучаснае ж абсталяванне дазваляе рабіць цуды. Высакаякасныя інкубатары, апараты штучнай вентыляцыі лёгкіх ад сусветных вытворцаў — гэтыя тэхналогіі сталі даступныя і нам.

Разам з намеснікам галоўнага ўрача па хірургіі Генадзем Вайцяховічам ідзём у аперацыйны блок хірургічнага корпуса. Ён складаецца з 5 пакояў. Яшчэ падчас суботніка тут зманціравалі абсталяванне, «навялі марафет». Цяпер ідзе падрыхтоўка да адкрыцця. Прасторныя светлыя калідоры, сцены па-майстэрску пафарбаваны навучэнцамі Бабруйскага мастацкага каледжа. Дзверы ў «святая святых» бальніцы адчыняюцца пры націску кнопкі.

А вось і лазернае афтальмалагічнае абсталяванне, якое дазволіць рабіць немаўлятам складаныя аперацыі на сятчатцы вока — раней яны выконваліся толькі ў сталіцы.

— Пераасначшэнне дае нам магчымасць працаваць на сусветным узроўні, — адзначае Генадзь Францавіч. — Сучаснае абсталяванне даражэй, але і аддача ад яго больш якасная. Нядаўна на грошы Нацбанка, якія былі перададзены бальніцы ў якасці падарунка, купілі электрамеханічны інструментарый для траўматалогіі і артапедыі. Ён вельмі зручны, прызначаны менавіта для дзяцей.

Усё новае патрабуе і дадатковых ведаў, але, як сцвярджае намеснік галоўнага ўрача, медперсанал прайшоў неабходнае навучанне на працягу апошніх трох гадоў.

Ёсць задумка стварыць пры хірургічным корпусе прыёмна-дыягнастычнае аддзяленне.

— Яно будзе займацца не толькі афармленнем і шпіталізацыяй пацыентаў, але і аказваць неадкладную медыцынскую дапамогу, — падкрэслівае Ігар Каско. — Плануецца, што на базе аддзялення будзе ўсё неабходнае, каб весці такую працу: камп'ютарны тамограф, рэнтген-кабінет, кабінет ультрагукавой дыягностыкі, неабходныя лабараторыі. У залежнасці ад вынікаў дыягностыкі будзе прымацца рашэнне, як лячыць пацыента — у стацыянары ці амбулаторна. Па такой схеме працуе ўвесь свет. Усе глядзелі па тэлевізары серыял пра доктара Хауса. Там, у прынцыпе, нічога не выдумана, усё зроблена так, як і павінна быць. Аналагічных аддзяленняў сёння ў Беларусі няма. Нешта падобнае створана толькі ў бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі ў Мінску. Вядома, пад такія структурныя падраздзяленні пакуль не існуе штатаў, але нехта павінен пачынаць. Чаму не мы? Спатрэбіцца год ці два, каб адпрацаваць сістэму, але, калі ў нас гэта атрымаецца, мы станем вельмі добрым прыкладам для пераймання.

**Нэлі ЗІГУЛЯ. Фота аўтара.**

✓*На працягу 2011-2013 гадоў на набыццё медыцынскага абсталявання на Магілёўшчыне з абласнога і мясцовых бюджэтаў накіравана 266 мільярдаў рублёў.*

✓*У 2013 годзе выдаткі на ахову здароўя ў Магілёўскай вобласці склалі больш за 2,5 трыльёна рублёў.*

✓*На ўмацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы летась выдаткавана больш за 271 мільярд рублёў.*

# КВАТЭР ШМАТ, А ПОПЫТ НА ІХ — НУЛЯВЫ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Цяпер толькі адно вышэйназванае агенцтва нерухомасці атрымлівае ў дзень каля 50-70 новых варыянтаў кватэр на здачу. База такога жылля ў Мінску працягвае павялічвацца ўжо апошнія два тыдні, бо патэнцыяльных кватарантаў у разы менш. З новай тэндэнцыяй на патаненне згаджаюцца далёка не ўсе гаспадары арэнднага жылля, таму цэннікі прапановы сёння яшчэ істотна не паменшыліся. Разам з тым, калі жыллё больш за месяц не знаходзіць сабе кватарантаў, яго ўладальнікі будуць вымушаны прымаць новыя правілы гульні.

## АДНАПАКАЁЎКІ З МЭБЛЯЙ ЁСЦЬ І ЗА 300 ДОЛАРАЎ

Максімальны аб'ём прапановы прымусіў уладальнікаў свабодных кватэр сур'ёзна паменшыць свае апетыты. Толькі за апошнія два месяцы сярэдні кошт арэнды стандартных кватэр паменшыўся на 70-90 долараў. Цяпер мінімальны цэннік аднапакаёвых кватэр складае ўсяго 300-350 долараў. Існуюць на рынку маленькія кватэры побач з метро і за 400-450 долараў, але на іх кліенты амаль не звяртаюць увагу. Так здарылася, што цяпер на рынку першую скрыпку іграюць менавіта патэнцыяльныя кватаранты. Выбар у іх цяпер максімальны па ўсіх катэгорыях жылля. Перавага даецца менавіта ліквідным кватэрам, якія размешчаны побач з лініяй метро і маюць сучасную мэблю, бытавую тэхніку, дзе абавязкова павінна прысутнічаць пральная машына. Тут існуе адно «але». У агенцтвах цяпер больш як палова варыянтаў кватэр у каталогу прапановы мае завышаны цэннік (450-500 долараў) пры існуючым мінімальным попыце. Спадарыню Лукашэвіч здзіўляе той факт, што амаль кожны другі ўласнік упэўнены ў нейкай выключнасці свайго жылля, якое абавязкова адшукае сабе кватаранта менавіта за вялікія грошы. Аднак цудаў на рынку не бывае...

Знізіўся ў апошнія тыдні і мінімальны кошт двухпакаёвых кватэр, які цяпер складае толькі 380-420 долараў. У рэдкіх выпадках больш якасныя двухпакаёўкі прапануюцца па 450-480 долараў. Разам з тым, на рынку цяпер магчыма адшукаць двухпакаёўкі стандартнай камплектацыі за 360-370 долараў. Галоўным патрабаваннем гаспадароў у такіх выпадках будзе перадаплата за арэнду за 3-4 месяцы, або прынцыповы выбар будучых кватарантаў сярод сямейных пар, якія збіраюцца здымаць жыллё абавязкова на працяглы час.

**На аднапакаёвыя кватэры па кошце 250-300 долараў цяпер кліенты яшчэ адшукаюцца. А вось у ліпені здаць стандартнае жыллё невялікіх памераў па такім цэнніку будзе ўжо праблематычна.**

Мінімальны кошт стандартных трохпакаёвых кватэр сёння складае 480-500 долараў, але на рынку іх значна менш, чым малапакаёвых жылых памяшканняў. Таму ў каталогу прапановы і цяпер хапае «ўпакаваных» трохпакаёвак за 600-800 долараў і нават даражэй. Разам з тым, у новых мікрараёнах вялікія па плошчы трохпакаёвыя кватэры без мэблі магчыма адшукаць і за 430-450 долараў.

## СПАРТЫЎНЫЯ ТУРЫСТЫ ПРЫВАТНЫМ ЖЫЛЛЁМ НЕ ЦІКАВЯЦЦА

Напярэдадні сусветнага першынства па хакеі наша газета паведамляла аб буйных апетытах асобных кватэраздатчыкаў, якія збіраліся мець добры куш дзякуючы замежным балельшчыкам. Але... Хацелі лёгкіх грошай, а засталіся каля разбітых ночваў. Надзеі прадпрымальных уладальнікаў жылля лёгка зарабіць падчас чэмпіянату, здаючы ў арэнду кватэры «на суткі», не апраўдаліся. Відавочна завышаныя цэны не прыцягнулі замежных турыстаў, а падрыхтаванае да ЧС жыллё ў гасцініцах, фан-вёсках і студэнцкіх інтэрнатах задавальняе попыт прыезджых фанатаў як па колькасці, так і па цане. Нагадаю, што да пачатку чэмпіянату ўласнікі, якія хацелі здаць кватэры «на суткі», прапаноўвалі сваё жыллё па кошце ад 150 да 800 долараў у суткі. Аднак ажыятажнага попыту на жыллё не было, таму мары нашых суайчыннікаў палопаліся як тыя мыльныя бурбалкі. Цяпер такое камфартабельнае жыллё нават у цэнтры сталіцы здаецца за 35-55 долараў, а ў рэдкіх выпадках — за 60-70 долараў за суткі. Больш за тое, па-ранейшаму на яго няма вялікага попыту.

**Агенцтва нерухомасці атрымлівае ў дзень каля 50-70 новых варыянтаў кватэр на здачу. База такога жылля ў Мінску працягвае павялічвацца ўжо апошнія два тыдні, бо патэнцыяльных кватарантаў у разы менш.**

З пачатку спартыўных спаборніцтваў у агенцтвах было афармлена не больш за дзесяць заявак з просьбай знайсці жыллё. Прычым прыватнымі апартаментамі цікавіліся не заходнія замежнікі, а грамадзяне Расіі. Пасля старту ЧС да спецыялістаў больш не паступіла ні адной заяўкі. Турыстаў падрабязна інфармавалі на мяжы і не толькі, колькі грошай можна траціць на таксі, ежу і жыллё. Акрамя таго, набыты на матчы білет дае магчымасць зняць таннае месца ў хостэле або інтэрнаце. Спецыялісты агенцтваў паведамляюць, што было некалькі камічных сітуацый, калі сям'я здымала кватэру за 400, 700 ці нават 900 долараў у месяц на працягу некалькіх гадоў, а напярэдадні чэмпіянату ўладальнікі «прасілі» іх вызваліць памяшканне. Цяпер такія «адукаваныя» прадпрымальнікі ў выніку засталіся ні з чым. Сёння іх кватэры на суткі нікому не патрэбны, а здаваць жыллё доўгатэрмінова за тыя ж грошы, што раней, ужо немагчыма, бо рынак патаннеў і стабілізаваўся.

## ДА ВОСЕНІ ЧАКАЕЦЦА СУР'ЁЗНАЕ ПАТАННЕННЕ

Эксперты сталічнага рынку арэнды ўпэўнены, што да першых дзён лета цэннікі па доўгатэрміновай арэндзе істотна не зменяцца. На гаспадароў пустога жылля будзе дзейнічаць эфект чакання лепшых часоў, калі тэндэнцыя зноў зменіцца. Аднак эканамічных падстаў для такіх змен сёння не існуе, лічыць наш эксперт. Больш за тое, існуюць перадумовы нават далейшага патанення гэтага сектара паслуг. Тут маецца на ўвазе той факт, што ўжо ў маі на рынак арэнды трапіць дастатковая колькасць сезонных кватэр ад бабуль, якія будуць жыць у сваіх садовых доміках ажно да восені. Праўда, існуе адно «але». Як толькі пачнецца павелічэнне колькасці здзелак па сегменце куплі-продажы кватэр, то адразу скароціцца ўзровень аб'ёму прапановы на рынку прыватнай арэнды жылля. А ўслед за такім скарачэннем прапановы можа адбыцца і чарговае падаражанне здымнага жылля. Хутчэй за ўсё, такая цэнавая ракіроўка адбудзецца не раней за верасень.

А пакуль Аксана Лукашэвіч раіць усім уладальнікам свабодных кватэр больш актыўна зніжаць цэны арэнды, каб атрымаць стабільны прыбытак мінімум да першых дзён восені. На аднапакаёвыя кватэры па кошце 250-300 долараў цяпер кліенты яшчэ адшукаюцца. А вось у ліпені здаць стандартнае жыллё невялікіх памераў па такім цэнніку будзе ўжо праблематычна, упэўнены наш эксперт.

Што тычыцца перспектыў на восень, то з гэтым пакуль не ўсё цалкам адназначна. Традыцыйна ў апошнія тыдні жніўня і ў верасні попыт на арэнднае бюджэтнае жыллё сур'ёзна павялічваецца, што ў мінулыя гады правакавала павялічэнне цэн. Падобныя прагнозы існуюць і на гэты сезон, аднак... Спадарыня Лукашэвіч адзначае той факт, што тая колькасць свабодных кватэр, якая існуе цяпер у Мінску, без вялікіх праблем перакрые будучы павышаны попыт магчымага студэнцкага ажыятажу. У гэты час «пік», на думку экспертаў, цэны на арэнду крыху падрастуць, аднак падаражанне будзе нязначным і кароткачасовым. Справа тут у тым, што існуючы памер цэннікаў на здымнае жыллё цяпер не адпавядае рэальным даходам будучых сярэднестатычных кватарантаў: долар у нас пакрысе даражэе, а заробкі мы атрымліваем у айчыннай валюце.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Свидетельство о государственной регистрации СП «Автоoss» УНП № 100345270 **считать недействительным в связи с утерей.**

**ИЗМЕНЕНИЯ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ**

**по объекту *«19-этажный жилой дом со встроенными административными помещениями в квартале ул. Аэродромная – ул. Левкова – ул. Володько», опубликованную в газете «Звязда» 26 февраля 2014 года:***

**Застройщик**: Общество с дополнительной ответственностью «Белпромоптторг», зарегистрировано Минским горисполкомом решением от 31 августа 2000 г. № 970 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 100587654.

Юридический и почтовый адрес: Республика Беларусь, 220053, г. Минск, переулок Червякова, дом 21А, помещение 2, комната 6.

**Тел.: 8 (017) 216 00 09, 8 (017) 388 54 64, 8 (029) 654 10 10, 8 (029) 708 46 64.**

Режим работы по вопросам долевого строительства: понедельник – пятница с 9.00 до 17.00, обед с 13.00 до 14.00, выходные дни – суббота, воскресенье.

Для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства предлагаются для граждан, состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, двухкомнатные, четырех- и пятикомнатные квартиры:

стоимость 1 $м^2$ 13 511 944 рубля. Цена сформирована на 14.05.2014 г. и является фиксированной на указанную дату.

УНП 100587654

Лепшая вядучая рэгіянальнага тэлебачання Вераніка ТАРАСЮК:

TV@R

# «Хачу кар'еру жонкі і маці!»

**Захапленне сваёй прафесіяй і вера ў тое, што там, дзе ты патрэбны, для цябе знойдзецца месца пад сонцам. Так можна апісаць творчы шлях Веранікі Тарасюк, якая пасля заканчэння гістарычнага факультэта пайшла працаваць у тэлерадыёкампанію «Брэст». Была вядучай навін, праекта «Палескі пачастунак», а цяпер працуе ў праграме «Ранішні эспрэса», для якой робіць рубрыку «Аколіца». За восем гадоў тэлевізійнай практыкі яна, здаецца, вывела для сябе формулу поспеху: трэба па-філасофску ставіцца да жыцця, тады і ўбачыш больш, і дойдзеш да сваіх перамог. Пацвярджэнне? Сёлета менавіта яна стала пераможцай Х Нацыянальнага тэлевізійнага конкурсу «Тэлевяршыня» ў намінацыі «Лепшая вядучая рэгіянальнага тэлебачання».**



**— Як успрынялі факт, што сталі ўладальніцай беларускага тэлевізійнага «Оскара»?**

— У плане эмоцый мне прыемна. А з іншага боку (я ўжо не адзін раз казала пра гэта і, думаю, пераможцы «Тэлевяршыні» ў персанальных намінацыях са мной могуць пагадзіцца), тэлебачанне не можа даваць узнагароду персанальна, хоць намінальна менавіта так адбываецца. Рэальна ацэньваючы сітуацыю, мы разумеем: узнагарода агульная, бо прадукт робіцца цэлай камандай, а не адным чалавекам. Ніхто не ўбачыць тое, што табе хочацца расказаць, калі не будзе, напрыклад, аператара, які здымае, рэжысёра, які манціруе, і многіх іншых людзей, якіх гледачы не бачаць у кадры. Падняўшыся на сцэну, пачала выказваць словы ўдзячнасці... Як бы пафасна тое ні прагучала, але я адчуваю вялікую ўдзячнасць да роднай зямлі, на якой жыву. Люблю Палессе і нашу Беларусь. Можна быць задаволеным альбо не прымаць нейкія моманты рэчаіснасці, але гэта наша краіна. Эмоцыі могуць узнікаць розныя, а прымаць жыццё тым ці іншым — выбар кожнага з нас. Не прымаючы сябе, ты застаешся геаграфічнай «сіратой», а я не хачу быць такой. І калі хоць адзін чалавек, які паглядзіць мае работы, даведаецца нешта новае і яшчэ больш палюбіць месца, дзе жыве, то я буду радавацца.

**— Мне здаецца, і для сябе вы можаце даведацца нямала новага...**

— Таму і займаюся гэтым. Ні для каго не сакрэт, што ў асноўным мы імкнёмся рабіць тое, да чаго ляжыць душа. Ведаеце, кажуць, калі няма той кнігі, якую б вам хацелася прачытаць, то напішыце яе. Гэтак жа і тут: ёсць жаданне даведацца нешта і ўбачыць — дзейнічайце. Вось на «Тэлевяршыню» мы адпраўлялі сюжэт з рубрыкі «Аколіца» пра Якава Громера. Я чытала нешта пра гісторыю Брэста і ўбачыла яго прозвішча. Адразу стала цікава, пачала шукаць інфармацыю, вывучаючы якую была нават шакіравана. Здзіўленая, я хадзіла некалькі дзён і ўсіх сяброў мучыла размовамі пра яго. Бо я даведалася нешта такое, чым адразу захацелася падзяліцца. А калі прысутнічае жывы інтарэс, то і спрацаваць атрымліваецца добра.

> **Усе мы людзі жывыя: часам на кані, бывае і наадварот. І вельмі важна ў цяжкі момант зрабіць правільны выбар: ты будзеш дзейнічаць альбо сядзець і скавытаць, што ў цябе не склалася жыццё.**

**— Як з'явілася рубрыка «Аколіца» і на што робіце акцэнты, ствараючы сюжэт працягласцю ў 4-5 хвілін?**

— «Аколіцу» я здымаю вось ужо амаль два гады. Спачатку, шчыра кажучы, нават не ўяўляла, што там можна паказваць, але зарыентавалася ў працэсе: пачаліся паездкі ў вёскі, на архітэктурныя аб'екты, потым сталі знаходзіць розныя цікавыя асобы. Ёсць дзе развярнуцца. Бываюць моманты, калі падрыхтаваць матэрыял удаецца вельмі хутка. Дапусцім, калі едзеш у нейкі населены пункт, там больш трэба паказваць, а не расказваць. Як вынік, больш працы ў працэсе. А вось возьмешся за нейкую асобу, дзе прысутнічае гістарычны кантэкст, і ўжо больш часу ідзе на тэарэтычную працу: шукаеш розныя крыніцы, правяраеш на дакладнасць. І тады дні тры можа пайсці на падрыхтоўку, бо трэба сабраць карцінку па крупіцах.

**— Вы з'яўляецеся адной з вядучых ранішняй праграмы. А як пачынаецца ваша раніца?**

— Як ні дзіўна, яна таксама пачынаецца з кубачка кавы. І яшчэ, думаю, няма нічога лепшага, чым пачынаць яе з думкі ўдзячнасці Богу за наступленне новага дня.

**— Прыход на тэлебачанне ў вашым выпадку — шчаслівае супадзенне?**

— Мабыць, так. Я шукала цікавую працу пасля заканчэння ўніверсітэта. Хацелася быць там, дзе мне спадабалася б, каб былі новыя знаёмствы, магчымасць мяняць дзейнасць. Напрыклад, у архіў я наўрад ці пайшла б працаваць, таму што там мне сумна. Знайшла тэлебачанне. Першапачаткова не разумела, што гэта за праца, бо зусім па-іншаму ўсё сабе ўяўляла. Потым у працэсе ўжо спасцігала ўсе нюансы. Трапіўшы ў гэтую прафесію, пачала яшчэ больш паважаць тэлевізіёншчыкаў, бо, калі ты ў ролі тэлегледача, здаецца, быццам усё лёгка і проста. А потым з'яўляецца магчымасць убачыць «тэлевізійную кухню», і стаўленне змяняецца. Ты пачынаеш разумець, якіх высілкаў патрабуе тэлевізійны прадукт.

**— Колькі вам спатрэбілася часу, каб рассмакаваць «тэлевізійную кухню»?**

— У маім выпадку спатрэбіўся класічны цыкл — каля года. Як кажуць, ва ўсім трэба перажыць чатыры сезоны. І вось, калі прайшлі мае першыя вясна, лета, восень і зіма на новай працы, тады больш ці менш асвоілася.

**— Калі спасцігаеш практыку, не абыходзіцца без гузакоў. У вас здараліся моманты, калі хацелася змяніць працу?**

— Калі чалавек у прафесіі больш за тры гады і ў яго ні разу не ўзнікала думкі «а што я тут раблю» і «як мне ўсё надакучыла», значыць, ён фанат таго, чым займаецца. А ўсе мы людзі жывыя: часам на кані, бывае і наадварот. І вельмі важна ў цяжкі момант зрабіць правільны выбар: ты будзеш дзейнічаць альбо сядзець і скавытаць, што ў цябе не склалася жыццё.

**— Вас можна лічыць фанатам сваёй прафесіі?**

— Я дакладна не фанат. У чалавека павінна быць усё: і праца, і асабістае. Ёсць у мяне нейкія моманты ў прафесійным плане, якія патрабуюць карэкціроўкі. Але ўнутранае жаданне быць лепшай таксама прысутнічае. Ведаеце, гэта як у адносінах з жанчынай мужчынам раяць: маўляў, калі хочаце, каб ваша жонка была добрай гаспадыняй і сустракала радасна вас з баршчом, то праявіце да яе любоў. Тады і яна будзе шчаслівай, і вы атрымаеце жаданае. Тое ж самае і з працай: толькі шчаслівы чалавек будзе паказваць добры вынік. Усё ж робіцца для некага — потым нехта будзе нас чытаць, слухаць, думаць.

> **Калі хоць адзін чалавек, які паглядзіць мае работы, даведаецца нешта новае і яшчэ больш палюбіць месца, дзе жыве, то я буду радавацца.**

Пажадана, безумоўна, каб твая праца мела вагу не толькі для цябе, і тады дакладна будзе прафесійная задаволенасць. Прыемна ж, калі бачыш зваротную рэакцыю гледача. Хаця не магу сказаць, быццам часта тэлефануюць і пішуць. На жаль, хутчэй можна дачакацца негатыўных водгукаў. Але ёсць і тыя, каму не ўсё роўна. Бывае, на вуліцы могуць сустрэць і выказаць удзячнасць. Я насамрэч таксама, калі нешта падабаецца, то магу і паленавацца тэлефанаваць, а пры сустрэчы абавязкова падзялюся меркаваннем.

**— Уяўляеце сваё жыццё без тэлебачання?**

— У прынцыпе, так, і, як мне падаецца, яно нічым бы не адрознівалася ад цяперашняга. Магчыма, я была б у адпачынку па цяжарнасці. Лічу, гэта самая важная прычына, каб сысці з тэлебачання. Часам сябры цікавяцца, ці хачу я зрабіць кар'еру, на што шчыра адказваю: «Так, хачу кар'еру жонкі і маці!» Для мяне, як для жанчыны, у прыярытэце менавіта такое бачанне будучага. Зразумела, жанчыне з творчым патэнцыялам захочацца рэалізоўваць сябе і ў працы. І я таксама б не змагла сядзець дома. Веру ў тое, што мудры мужчына заўсёды падтрымае імкненне каханай праявіць сябе, а не будзе яго душыць у корані. Калі жыццё ставіць перад выбарам і ты можаш выбраць два варыянты, то не варта адмаўляцца і спыняцца на адным. Ёсць сумненні і супярэчнасці — тады выбірай лепшы.

**— Якое ваша стаўленне да часу? І дзе б вы хацелі жыць?**

— Я абсалютна дакладна ведаю, што хачу жыць тут і цяпер. Безумоўна, цікава было б здзейсніць падарожжа ў часе, убачыць на ўласныя вочы тое, пра што так шмат чытала. Існуюць розныя погляды наконт цячэння часу. Я ўпэўнена перш за ўсё ў тым, што кожны наш учынак мае сэнс, прычыну і наступствы. Таму з якім пасылам робіш нешта, з такім і вяртаецца ўсё да цябе. Жыццё ж складаецца з імгненняў і трэба пражываць іх з асалодай.

**Алена ДРАПКО.**

■ Прага колеру

# ПАД МУЗЫКУ МАДОННЫ

## Біяграфіі беларускіх мастакоў, якія пакарылі Францыю, прагучаць па-новаму

**Белтэлерадыёкампанія і Белгазпрамбанк прэзентавалі маштабны тэлевізійны аўтарскі цыкл Алега Лукашэвіча «Мастакі Парыжскай школы. Ураджэнцы Беларусі». Першы фільм цыкла «Хаім Суцін. Прага колеру» быў прадстаўлены днямі на суд спецыяльных гасцей і журналістаў.**

— Праект разлічаны на шырокую аўдыторыю, каб гледачы пасля прагляду зразумелі, што ў нас ёсць людзі, якімі можна і варта ганарыцца. Мы яшчэ не пра ўсіх расказалі, хто нарадзіўся ў Беларусі і зрабіў свой уклад у сусветнае мастацтва. Таму, думаю, праект будзе мець працяг, бо ёсць вялікі інтарэс да гэтай тэмы ў грамадстве, — сказаў аўтар сцэнарыя і рэжысёр Алег Лукашэвіч. — Першапачаткова, калі праца толькі задумвалася, была пастаўлена задача зрабіць праект міжнародным, каб паказаць яго не толькі ў Беларусі, але і за яе межамі. І сёння ім ужо зацікавіліся ў Ізраілі і ў Францыі.



Дакументальны асветніцка-адукацыйны праект складаецца з 9 фільмаў, у кожным з якіх раскрываецца жыццё і творчасць аднаго мастака. І калі імёны Марка Шагала, Льва Бакста, Хаіма Суціна — у многіх на слыху, а пра Надзею Хадасевіч-Лежэ, Восіпа Цадкіна, Міхаіла Кікоіна, Пінхуса Крэмене — збольшага ведаюць тыя, хто цікавіцца мастацтвам, то імёны Восіпа Любіча, Шрагі Файбіша-Зарфіна былі наогул малавядомымі.

Творчая група Алега Лукашэвіча і Аляксандра Аляксеева працавала над праектам каля двух гадоў. Былі даследаваны шматлікія архівы ў Беларусі, Расіі, Францыі. Гледачам будуць упершыню прадстаўлены малавывучаныя і невядомыя дакументы. Так, напрыклад, у Беларускім дзяржаўным архіве кінафотафонадакументаў была выпадкова выяўлена кінахроніка першай гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Віцебску 1918 года. Аднак у фондах яна значылася 1923 годам. Якім жа было здзіўленне аўтараў цыкла, калі ў гэтым матэрыяле ўбачылі Марка Шагала! (Майстар пакінуў Савецкі Саюз у 1922 годзе. — **Аўт.**)

Здымкі праекта праводзіліся ва ўсёй Францыі: ад Парыжа да Лазурнага берага, у месцах, звязаных з жыццём і творчасцю мастакоў. Адбыліся сустрэчы з многімі іх сваякамі: з сынам Марка Шагала — Дэвідам Мак-Нілам, з дачкой Восіпа Любіча — Дзінай Любіч і іншымі, што дазволіла знайсці не толькі новую інфармацыю, але і ўдакладніць біяграфію мастакоў.

Кожны 26-хвілінны фільм будуецца на дакументальнай біяграфіі героя з выкарыстаннем інтэрв'ю са сваякамі, мастацтвазнаўцамі, калекцыянерамі, экспертамі і іншымі спецыялістамі. Прадстаўлены вядомыя мастацтвазнаўцы: Марк Рэстэлліні, дырэктар Парыжскай пінакатэкі; Ірына Антонава, дырэктар Расійскага дзяржаўнага музея выяўленчых мастацтваў імя А.С. Пушкіна; Надзін Нешавер, эксперт Парыжскай школы 1905-1939 гг. і іншыя. Дэталёва паказваецца творчасць мастакоў — пры дапамозе здымак арыгіналаў карцін, дакументаў, фатаграфій. У тым ліку маштабна паказана і карпаратыўная калекцыя партнёра праекта — Белгазпрамбанка, якая налічвае больш за 50 твораў мастацтва.

Для найбольш яркага і выразнага раскрыцця біяграфіі герояў выкарыстаны пастановачныя здымкі з прыцягненнем акцёраў. Так у ролі Марка Шагала можна будзе ўбачыць народнага артыста Беларусі Віктара Манаева, у ролі Міхаіла Кікоіна — заслужанага артыста Рэспублікі Беларусь Андрэя Душачкіна...

З кожным уладальнікам аўтарскіх правоў заключаны кантракт, атрымана адабрэнне ад Камітэта Марка Шагала. Дарэчы, першым гледачом праекта стала спявачка Мадонна, якая пасля прагляду падпісала пагадненне на выкарыстанне яе музыкі ў фільмах.

У Беларусі прэм'еру 9 фільмаў аўтарскага цыкла «Мастакі Парыжскай школы. Ураджэнцы Беларусі» першымі ўбачаць гледачы тэлеканала «Беларусь 1» 24 мая. Кожную суботу і нядзелю будзе праходзіць паказ аднаго фільма. Таксама пасля прэм'еры цыкл будзе прадстаўлены ў эфіры тэлеканалаў «Беларусь 3» і «Беларусь 24».

**Алена ДРАПКО**

■ Медыяпрастора

| | | | |
|---|---|---|---|
| Брэст | 106.6 FM | Бабруйск | 103.6 FM |
| Віцебск | 101.8 FM | Баранавічы | 98.4 FM |
| Мінск | 107.1 FM | Салігорск | 104.3 FM |
| Гродна | 104.2 FM | Пінск | 103.2 FM |
| Магілёў | 107.8 FM | | |

МИР

# У СВЕЦЕ ВЫСОКІХ ТЭХНАЛОГІЙ

**Кожны будны дзень у эфіры радыё «Мір» вашай увазе прапануецца праграма з Аляксеем Патаповічам «High Tech» — рубрыка пра апошнія дасягненні беларускіх і замежных вучоных у сферы навукі і высокіх тэхналогій.**

Агляд рынкаў мабільных прылад і камп'ютараў, апошнія дасягненні вучоных, а таксама інфармацыя пра жыццё ў сацыяльных сетках і віртуальным свеце камп'ютарных гульняў. Пра ўсё гэта распавядае «High Tech» — рубрыка для тых, хто цікавіцца новым і незвычайным на прасторы кам'ютарных гульняў і разнастайных гаджэтаў. Не прапусціце час выхаду па буднях — 11.15 і 20.15. А па суботах у 11.30 і 20.30 вас чакае пашыраны выпуск, дзе збіраюць самыя цікавыя навіны тыдня.

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

## ПАНЯДЗЕЛАК, 19 МАЯ

### БЕЛАРУСЬ 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.25** Навіны.
**7.05, 8.05** Дзелавое жыццё.
**7.10, 8.10, 19.40, 0.05** Зона Х.
**9.10** Галоўны эфір.
**10.05** Клуб рэдактараў.
**10.45** «Зорнае жыццё». «Нечаканыя выбраннікі зорак».
**12.10** «Мая праўда». «На-На: Куміры з падваротні». Частка 1-я.
**13.05 Меладрама «Мільянер».**
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25 Трагікамедыя «Марафон».**
**17.20** Нашы.
**17.35** Беларуская часінка.
**19.20** Арэна.
**19.55** Форум.
**21.00** Панарама.
**21.45 Серыял «Дыверсант. Канец вайны».**
**23.50** Актуальнае інтэрв'ю.
**0.40** Чэмпіянат свету па хакеі 2014. Агляд гульнявога дня.
**1.05** Дзень спорту.

### БЕЛАРУСЬ 2

**7.00** Раніца.
**9.00, 10.10, 20.35** Тэлебарометр.
**9.05, 15.35 Дэтэктыў «Прыгоды натарыуса Неглінцава».**
**10.45, 0.40 Дэтэктыў «Разведка». 1-я серыя.**
**11.50 Серыял «Ластаўчына гняздо».**
**13.45** «Два з паловай кухары. Адкрытая кухня».
**14.30, 0.00** «Перазагрузка». Маладзёжнае ток-шоу.
**15.15** «Кіпень».
**16.40** Хакей. Чэмпіянат свету. Данія — Францыя.
**19.05 Серыял «Метад Фрэйда».**
**20.40** Хакей. Чэмпіянат свету. Латвія — Беларусь. У перапынку: **21.15** КЕНО.
**23.00 Серыял «Рэальныя хлопцы».**
**1.30** Музычны конкурс «GBOB» у Беларусі.

### БЕЛАРУСЬ 3

**7.20** «Дабранакак».
**7.50** «Хачу ўсё ведаць!».
**8.00, 13.55, 17.00, 21.05, 0.30** «Калейдаскоп».
**8.10, 14.05, 17.10, 0.40** «Сімвалы эпохі». Яйкі Фабержэ.
**8.25** Дзіцячы фільм. «Юрка — сын камандзіра».
**9.35, 22.00** «Дыя@блог». «Пра мову».
**10.00, 21.15 Серыял «Мегрэ».**
**10.50, 0.05** «Святло далёкай зоркі». Памяці кампазітара Мікалая Аладава.
**11.15, 17.50** «Размаўляем па-беларуску».
**11.20** «Мой шлях». Творчы вечар народнага артыста Беларусі Уладзіміра Гасцюхіна.
**12.10 «Узыходжанне». Маст. фільм.**
**14.20** «Музей Янкі Купалы». Дак. фільм.
**14.40** «Цуды прыроды». Емен. Аман. Індыйскі акіян.
**15.05** «Росчырк часу». Мастак Уладзімір Андрыянаў.
**15.20** М/ф.
**15.50** «Роднае слова». Жыццё і творчасць пісьменніка Каруся Каганца.
**16.20** «Палескі пачастунак». Салат «Горкая капуста».
**16.35** «Фабрыка цудаў». «Мастак-пастаноўшчык». Дак. фільм.
**17.25** «Наша спадчына». Кушлянская сядзіба.
**17.55 «Кола». Маст. фільм.**
**18.15** «Прастора Яўгена Лысіка». Творчасць мастака-сцэнографа.
**18.30** «Брэсцкая ўнія». Дак. фільм.
**19.00** «Краіна лясоў і азёраў». Дак. фільм.
**19.20** «Падарожжа са смакам». Нідэрланды.
**19.55 «Сышчык Пуцілін». Маст. фільм.**
**20.45** Калыханка.
**22.25 «Настаўнік». Маст. фільм.**

### БЕЛАРУСЬ 5

**7.10, 15.35** Хакей. Чэмпіянат свету-2014. Агляд гульнявога дня.
**8.10** Хакей. Чэмпіянат свету-2014. Расія — Германія.
**10.00** Хакей. Чэмпіянат свету-2014. Канада — Швецыя.
**11.55** Хакей. Чэмпіянат свету-2014. ЗША — Фінляндыя.
**13.45** Хакей. Чэмпіянат свету-2014. Чэхія — Нарвегія.
**16.40** Хакей. Чэмпіянат свету-2014. Казахстан — Фінляндыя.
**19.00** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.
**19.30** «На шляху да чэмпіянату свету па футболе — 2014». Відэачасопіс.
**19.55** Хакей. Чэмпіянат свету-2014. Прэв'ю.
**20.40** Хакей. Чэмпіянат свету-2014. Італія — Швецыя.
**23.20** Хакей. Чэмпіянат свету-2014. Латвія — Беларусь.
**1.10** Час футбола.

### АНТ

**6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** Контуры.
**10.05** «Жыць здорава!».
**11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10** «У наш час».
**12.05** «Яны і мы».
**13.10** «Справа ваша...».
**13.55** «Модны прыгавор».
**15.00** «Сам-насам з усімі».
**16.15** «Зразумець. Дараваць».
**16.55** «Давай пажэнімся!».
**18.20** «Адваротны адлік. «Ігнат Дамейка. Герой Чылі з-пад Наваградка».
**18.55** «Чакай мяне».
**20.00** Час.
**21.05** Ток-шоу «Пазіцыя».
**22.05 Драма «Палёт над гняздом зязюлі».**
**0.30** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 10.40, 13.50, 18.30, 23.00** Дзённік «Дзеці — гэта ХараШоу».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**8.30** «Тыдзень».
**9.45** «Вялікае снеданне».
**10.45, 17.30** «Званая вячэра».
**11.45** «Такі лёс».
**12.30** «Чатыры вяселля».
**13.55** «Далёкія сваякі».
**14.10** «Зорны рынг. Новы сезон. Бітва кавер-бэндаў». «ARTEFACT» супраць «Эйфарыя».
**15.15** «Іншая краіна». «Сінгапур. «З бруду ў князі».
**16.20** «Наша справа».
**16.50** «Шай-бу! Shai-BY!..». «Першы перыяд».
**17.20** «Міншчына».
**18.35** «Мае цудоўныя...».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15, 20.40 Баявік «Рамзэ павінен памерці».**
**20.30** «Гарачы лёд».
**23.05** «Ваенная тайна».
**0.15 «Знахар». Серыял.**

### МІР

**5.00** «180 хвілін».
**7.15, 23.00** Беларусь сёння.
**8.15 Серыял «Імперыя пад ударам».**
**10.10, 0.45 Маст. фільм «Дваццаць дзён без вайны».**
**12.00, 15.00, 18.00, 21.00** Навіны Садружнасці (бягучы радок) .
**12.20 Серыял «Чужыя памылкі».**
**14.05** Дак. фільм «Севастопальскія апавяданні».
**15.20, 23.30** Ток-шоу «Слова за слова».
**16.10 Серыял «Лепшы горад Зямлі».**
**18.20, 2.30 Серыял «Дзённік забойцы».**
**21.20 Серыял «Узрыўныя дзяўчаты».**
**0.20** «Агульны інтарэс».

### РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00** «Раніца Расіі».
**10.00** «Карціна свету».
**10.55** Надвор'е на тыдзень.
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Прамы эфір».
**12.50** «Асаблівы выпадак».
**13.50, 16.50, 19.50, 0.25** Навіны — Беларусь.
**14.30** «Цыліндры фараонаў. Апошняя тайна».
**15.35** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу.
**17.40 Серыял «Гаспадыня майго лёсу».**
**18.45 Серыял «Пакуль станіца спіць».**
**20.50 Серыял «Добрае імя».**
**23.30 «Маскоўскі дэтэктыў. Чорная воспа».**

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.00** «НТБ раніцай».
**8.45** «Новыя рускія сенсацыі».
**9.35, 10.20 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**11.00** «Да суда».
**11.55** «Суд прысяжных».
**13.25** «Суд прысяжных. Канчатковы вердыкт».
**14.25** «Справа ўрачоў».
**15.10** «Гатуем з Аляксеем Зіміным».
**15.40, 18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.25** «Пракурорская праверка».
**17.35** «Гаворым і паказваем». Ток-шоу.
**19.40 Серыял «ППС-2».**
**21.20 Серыял «Дазнаўца-2».**
**23.05** Сёння. Вынікі.
**23.30 Серыял «НС — надзвычайная сітуацыя».**

### 8 КАНАЛ

**7.00, 13.30, 19.00, 20.55, 23.55** «Надвор'е».
**7.05 Серыял «Сафія цудоўная».**
**7.30 Камедыя «Аднакласніцы-2».**
**9.15, 13.55** «Тэлемагазін».
**9.35 Серыял «Смерць у раі».**
**10.35 Драма «Хросны бацька». 1-я серыя.**
**13.35** «Кінаблакнот».
**14.25 Серыял «У чым віна Фатмагуль».**
**16.05** Мультпарад.
**16.30** «Мой любімы гадавальнік».
**17.00 Серыял «Паліцыя Гаваяў».**
**17.55 Серыял «Смерць у раі».**
**19.05 Серыял «Добрая жонка».**
**20.45** «Вечарніца».
**21.00 Драма «Вялікая гульня».**
**22.45 Серыял «Да смерці прыгожая».**

### ВТБ

**6.00, 1.00** «PLAY».
**8.00** М/ф «Смяшарыкі».
**8.30, 0.30** Скетч-шоу «6 кадраў».
**9.00** «Спытайце кухара».
**10.00** «Паспець за 24 гадзіны».
**11.00** «Кіно ў дэталях».
**12.00, 20.00 Серыял «Апошні з Магікян».**
**13.00, 23.10** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**14.00** Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
**15.00 Серыял «Нанакаханне».**
**16.00 Меладрама «Бэндслэм».**
**18.30, 0.00** «Лаві момант».
**19.00 Серыял «Нефармат».**
**21.10 Меладрама «Як жаніцца і застацца халастым».**

### КУЛЬТУРА

**6.00** «Еўраньюс».
**9.00, 14.00, 18.00, 22.15** Навіны культуры.
**9.15, 23.10** «Назіральнік».
**10.15, 0.40 «Пэры Мэйсан». Серыял.**
**11.10** «Сусветныя скарбы культуры».
**11.30** «Эрмітаж-250».
**11.55** «Лінія жыцця». Станіслаў Любшын.
**12.50 «Карл Маркс. Маладыя гады». Маст. фільм. 1-я серыя.**
**14.10** Прарок у сваёй айчыне. «Яўграф Фёдараў. У глыбіні матэрыі».
**14.35 «Старшыня». Маст. фільм.**
**17.10** Academia.
**18.15** Галоўная роля.
**18.30** «Саці. Нясумная класіка...».
**19.15** «Правілы жыцця».
**19.40** Навука без межаў. «Ці ёсць пол у майго мозгу?» Дак. фільм.
**20.35** «Тым часам».
**21.25** «Дынастыя без грыму». Раздзел першы.
**22.35** «Фестывальнае кіно». Па-за конкурсам. «Прыпынак». Дак. фільм.
**0.05** П.І. Чайкоўскі. Канцэрт № 1 для фартэпіяна з аркестрам.
**1.35** «Pro memoria». «Лютэцыя Дэмарэ».

### НАСТАЛЬГІЯ

**5.00** «Што? Дзе? Калі?». Матч-рэванш. 1984 год.
**6.40** Фільм-канцэрт «Вас запрашае Сафія Ратару». 1985 год.
**8.00** Канцэрт замежнай эстрады.
**8.25** «Бліц». 1990 год.
**9.00 Маст. фільм «Дзіўны хлопчык».**
**10.25** Фільм-канцэрт «Вось зноў гэты двор». 1986 год.
**11.00** «Песня-73». 1973 год.
**12.00, 3.00** «Колба часу».
**13.00** «Пакуль усе дома».
**13.30** «Сядзі і глядзі». 1994 год.
**13.45 Маст. фільм «Бабкі надвае варажылі».**
**15.05** «Тэатральныя сустрэчы». 1983 год.
**16.15** «Маленькі канцэрт». 1997 год.
**16.30** «КВЗ-62». Конкурс «Умелыя рукі». 1962 год.
**17.00** «Зорны час». Тэлевіктарына. 1993 год.
**17.45** «Святочны піянерскі канцэрт». 1983 год.
**18.20** Тэлеспектакль «Бярозавая галінка». 1-я частка. 1987 год.
**20.00, 2.00** «Мінулы час».
**21.00** «Народжаныя ў СССР».
**22.00** «Трыбунал». Канцэрт Наталлі Мядзведзевай. 1995 год.
**23.00** «Шапэніяна». Юбілейны вечар н.а. СССР Галіны Уланавай. 1974 год.
**0.00** «Нью-Ёрк, Нью-Ёрк». 1995 год.
**0.30 Тэлефільм «Следства вядуць знатакі».**
**4.00** «Кінапанарама». «Дзень нараджэння ў Маскве». 1990 год.

### EUROSPORT

**9.30** Аўта- і мотаспорт.
**9.45, 21.00, 0.05** Футбол. Чэмпіянат Еўропы (U-17).
**11.00** Веласпорт. Нацыянальны тур.
**12.00** Веласпорт. Нацыянальны тур Італіі.
**13.00** Тэніс. Турнір АТР.
**20.00** Тэніс. Рыхтуемся да «Ралан Гарос».
**20.15, 1.30** Футбол. Еўрагалы.
**20.45, 2.00** Футбол. Бразілеманія.
**22.00** Пра рэстлінг.
**23.30** Конны спорт. Скокі.
**23.50** WATTS.

### КАМЕДЫЯ

**5.00, 10.55, 17.00, 19.00, 2.05** Скетчком «Паміж намі».
**5.15, 8.00, 2.20** Серыял «Гэта ўсё пра Джаан».
**5.55, 8.45, 12.40, 13.45, 16.40, 20.45, 3.05** «Камедыянты. Лепшае».
**6.15** Камедыя «Мая мачаха — іншапланецянка».
**8.20** Камедыя «Пажарны».
**9.00** Камедыя «Звар'яцелы прафесар 2: Сямейства Клампаў».
**11.15** Маст. фільм «Я буду дома да Каляд».
**12.55, 16.00, 21.00** Серыял «Доўга і шчасліва».
**14.10** Камедыя «У нагу!».
**17.20** Камедыя «Помста сябровак нявесты».
**19.20** Прыгоды «Каханне на востраве».
**21.45** Камедыя «Патройная непрыемнасць».
**22.10** Камедыя «Учора, сёння, заўтра».
**0.10** Меладрама «Змерзлая з Маямі».
**1.45** Камедыя «Яго перараджэнне».
**3.25** Меладрама «Дзеля любові да Мэры».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**8.30** «Сардэчна запрашаем дадому!».
**9.10, 18.30, 2.50** «Забароненае каханне». Серыял.
**10.45** «Паненка і кулінар».
**11.15** «Паралельны свет». Дак. серыял.
**12.15** «Варажбітка». Дак. серыял.
**13.15** «Паляўнічыя на прывіды». Дак. серыял.
**13.45** «Жонка. Гісторыя кахання». Наталля Селязнёва.
**15.10** «Сто пытанняў даросламу». Алена Абразцова.
**16.00, 22.10, 5.10** «Зорныя гісторыі».
**17.00** «Простыя складанасці». Дак. серыял.
**17.30** «Справа Астахава». Дак. серыял.
**20.20** «Шапавалаў». Серыял.
**21.20, 4.30** «Жыццё і лёс». Серыял.
**23.00** Маст. фільм «Схаваная пагроза».
**0.30** «Хадзячыя мерцвякі». Серыял.
**1.15** «Часова даступны». Уладзімір Хаціненка.
**2.10** «Без падману».

### ТБ1000

**5.30** М/ф «Рабі ногі».
**7.30, 13.15** М/ф «Дом-монстар».
**9.15** Драма «Чалавек, якога не было».
**11.25** Меладрама «Каханне з паведамленнем».
**15.10** Драма «Доказ».
**17.10** Меладрама «Жорсткія гульні».
**19.00** Меладрама «Каханне».
**21.20** Баявік «Патрыёт».
**0.10** Камедыя «Падтрыманыя львы».
**2.05** Драма «Забытыя жаданні».
**3.55** Меладрама «Рэальнасць кусаецца».

### ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

**6.00** Камедыя «Лёгкае жыццё».
**8.00** Меладрама «Мегаполіс».
**10.00** Баявік «Брыгада: Спадчыннік».
**12.00** Казка «Снежная каралева».
**13.30** Драма «Юнкеры».
**16.20** Меладрама «На кручку!»
**18.00** Драма «Рабінавы вальс».
**20.00** Камедыя «Самазабойцы».
**21.40** Меладрама «Пацалунак скрозь сцяну».
**23.30** Баявік «Брат».
**2.00** Фантастыка «Рэжым поўнага апускання».
**4.00** Камедыя «У Расію па каханне!».

### NATIONAL GEOGRAPHIC

**5.00** Інжынерныя ідэі.
**6.00** Дзікая прырода Амерыкі.
**7.00** Паляванне на паляўнічага.
**8.00, 13.00, 18.00, 21.00, 0.00, 3.00** Космас: Прастора і час.
**10.00** Золата Юкана.
**11.00** Скарбашукальнікі.
**12.00** Гульні розуму.
**12.30** Займальная навука.
**15.00** Самыя небяспечныя жывёлы.
**16.00** Экстрэмальнае падарожжа.
**17.00, 2.00** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха.
**20.00, 1.00, 4.00** Навука будучага Стывена Хокінга.
**23.00** Турэмныя цяжкасці.

### DISCOVERY

**7.00** Амерыканскі чопер.
**7.50, 12.20** Выжыванне без купюр.
**8.40** Як гэта ўстроена.
**9.10, 20.05, 4.45** Як гэта зроблена?
**9.35** Што ў вас у гаражы?
**10.30, 0.55** Top Gear.
**11.25** Не спрабуйце паўтарыць.
**13.15, 16.00, 6.05** Махінатары.
**14.10, 3.55** Хуткія і гучныя.
**15.05** Беар Грылс: кадры выратавання.
**17.20, 3.05** Паляўнічыя на рэліквіі.
**18.15** Неверагодны хмарачос.
**19.10** Круцей не прыдумаеш.
**20.35** Патрабуецца зборка.
**21.00** Рэальныя дальнабойшчыкі.
**22.00** Смяротныя астравы.
**23.00** Голыя і напалоханыя.
**0.00, 5.10** Будучыня.
**1.50** Сапраўдныя аферысты.
**2.40** Маланкавыя катастрофы.

# ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

**ООО «АРТЕС-СТРОЙИНВЕСТ»**
**информирует юридических и физических лиц о строительстве объекта: «Группа многоквартирных жилых домов по генплану №№ 11, 12, 13 в микрорайоне № 1 реконструируемой застройки в границах ул. Шаранговича, Горецкого, Рафиева (бывшая дер. Сухарево)» (без наружных инженерных сетей) (далее – Объект).**

Настоящая публикация отменяет декларации, опубликованные в газете «ЗВЯЗДА» 29.10.2013, 08.02.2014, 12.03.2014 и 01.04.2014 в разрезе остатка квартир, на которые не заключены договоры долевого строительства.

**ЗАСТРОЙЩИК** по Объекту – ООО «АРТЕС-СТРОЙИНВЕСТ» зарегистрировано решением Минского городского исполнительного комитета от 15.05.2008 г. в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 191024785. **Адрес**: 220035, г. Минск, ул. Гвардейская, д. 16, пом. 2Н, каб. 1, тел. 306-06-11. Режим работы: понедельник–пятница: с 09.00 до 17.30, выходные дни – суббота, воскресенье.

Застройщиком осуществлено строительство жилых домов по адресу: г. Минск, ул. В. Игнатовского, д. 8 (2009-2010 гг.).

**Объект состоит** из домов №№ 11, 13 (конструкции ОАО «МАПИД») и № 12 корпус 1, 12 корпус 2 (конструкции ОАО «МДК») по генплану в границах ул. Шаранговича, Горецкого, Рафиева (бывшая дер. Сухарево), инженерных сетей и инженерно-транспортной инфраструктуры. Первым этапом предусмотрено строительство жилого дома № 13 по генплану. Дома запроектированы с техническим подпольем и теплым чердаком, предусмотрено центральное отопление. Благоустройство дворовой территории: детская игровая площадка, места для отдыха взрослых, малые архитектурные формы.

К долевому строительству предлагается вторая очередь строительства Объекта жилой дом № 13 по генплану на 445 квартир состоящий из десяти подъездов 10-этажных секций серии КПД М464-У1.

**Цель проекта строительства** – исполнение решения Мингорисполкома «Об изъятии, предоставлении земельных участков, прекращении права частной собственности на земельный участок и разрешении строительства» № 336 от 14 февраля 2013 г.

**Условия оплаты стоимости объекта долевого строительства:**

Начало строительства объекта (ж/д № 13) – июнь 2013 года.

Окончание строительства объекта (ж/д № 13) – четвёртый квартал 2014 г.

Общая площадь квартир объекта (ж/д № 13): – 26 362,04 $м^2$ (445 квартир).

Состав общего имущества в многоквартирном жилом доме, которое будет находиться в общей долевой собственности дольщиков после ввода объекта в эксплуатацию: межквартирные лестничные клетки, лестницы, вентшахты, коридоры, крыши, другие места общего пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых домов и (или) нежилых помещений, элементы озеленения и благоустройства, а также иные объекты недвижимости, служащие целевому использованию здания, поступают в общую собственность дольщиков.

***Для заключения договоров долевого строительства с гражданами, не состоящими на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, предоставляются*** в жилом доме № 13 по генплану следующие квартиры:

а) **7 (семь) однокомнатных** квартир со строительными номерами №№ 229, 263, 287, 343, 355, 382, 383 по цене **14 350 000** (четырнадцать миллионов триста пятьдесят тысяч) рублей 1 $м^2$ объекта долевого строительства с оплатой не менее 50% стоимости объекта долевого строительства не позднее 7 (семи) банковских дней со дня регистрации договора;

б) **2 (две) двухкомнатные** квартиры со строительными номерами №№ 298, 339 по цене **13 250 000** (тринадцать миллионов двести пятьдесят тысяч) рублей 1 $м^2$ объекта долевого строительства с оплатой **не менее 40%** стоимости объекта долевого строительства не позднее 7 (семи) банковских дней со дня регистрации договора. **При оплате 100%** стоимости объекта долевого строительства не позднее 7 (семи) банковских дней со дня регистрации договора цена объекта долевого строительства составит **12 800 000** (двенадцать миллионов восемьсот тысяч) рублей за 1 $м^2$;

в) **10 (десять) трехкомнатных** квартир со строительными номерами №№ 33, 40, 80, 85, 95, 127, 206, 212, 217, 269 по цене **12 800 000** (двенадцать миллионов восемьсот тысяч) рублей 1м2 объекта долевого строительства с оплатой **не менее 40%** стоимости объекта долевого строительства не позднее 7 (семи) банковских дней со дня регистрации договора. При оплате **100% стоимости** объекта долевого строительства не позднее 7 (семи) банковских дней со дня регистрации договора цена объекта долевого строительства составит **12 400 000** (двенадцать миллионов четыреста тысяч) рублей за 1 $м^2$.

Цена 1 $м^2$ объекта долевого строительства сформирована на 31.03.2014 г. и является фиксированной на указанную дату и дифференцированной в зависимости от количества комнат.

Квартиры передаются дольщикам без чистовой внутренней отделки.

Условия ознакомления дольщиков с объектом долевого строительства и ходом работ по его строительству: по согласованию с Застройщиком.

**Застройщик имеет следующие разрешительные документы**:

- разрешение на проведение проектно-изыскательских работ – Акты выбора размещения земельного участка, утвержденные председателем Мингорисполкома 27.04.2011 г. и 08.12.2011 г.;
- решение Минского городского исполнительного комитета от 14 февраля 2013 года № 336 о разрешении строительства объекта;
- свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации создания земельных участков:

временного пользования №500000000006006946, площадью 1,2992 га;
постоянного пользования 500000000006006868, площадью 0,5571 га;
постоянного пользования 500000000006006869, площадью 0,0098 га;
постоянного пользования 500000000006006870, площадью 0,0081 га;
постоянного пользования 500000000006006871, площадью 0,0079 га;

- проектно-сметная документация, прошедшая государственную экспертизу (экспертное заключение, выданное РУП «Главгосстройэкспертиза» от 09.11.2012 г. № 995-15/12;
- договор строительного генподряда № 07-03/1 от 07.03.2013 г., заключенный с ОАО «МАПИД»;
- договор о долевом участии в финансировании проектирования и строительства инженерной и транспортной инфраструктуры № 11/И-2012 от 16.05.2012 г., заключенный с КУП «УКС администрации Фрунзенского района г. Минска»;
- выданное органом государственного строительного надзора разрешение на проведение строительно-монтажных работ от 04 июня 2013 г. № 2-208Ж-015/13.

**Информацию об объекте долевого строительства**, планировках квартир и условиях заключения договоров можно получить у Застройщика по телефону 8 (017) 3060611 или в риэлтерской организации ООО «ДИНАС» (сайт www.dinas.by, тел. 8 (017) 2339610).


■ Соцыум

# НЕ ДАЦЬ АСТУПІЦЦА ЗНОЎ

## Інтэграцыя былых асуджаных у грамадства павінна скараціць колькасць злачынстваў

**Кожны другі раней судзімы ў нашай краіне становіцца рэцыдывістам, кажуць эксперты. Вярнуцца да нармальнага жыцця гэтым людзям перашкаджаюць не толькі крымінальныя схільнасці. Што ж прымушае былых зняволеных зноў пераступаць закон? І як ім дапамагчы?**

### РАЗАРВАНЫЯ СУВЯЗІ

Не сакрэт, што большасць былых зэкаў, выйшаўшы на волю, сутыкаецца з праблемамі з працай, жыллём, напружанасцю ва ўзаемаадносінах з праваахоўнымі органамі, для якіх судзімы часта становіцца «пастаянным кліентам». У многіх разарваныя сувязі з блізкімі, якія адмаўляюцца ад кантактаў з такімі сваякамі. Жонкі разводзяцца, а бацькі, бывае, паміраюць, так і не дачакаўшыся сына...

Між тым, 75% злачынстваў учыняецца асобамі, якія нідзе не працуюць, — кажа **намеснік начальніка ўпраўлення наглядзорна-выканаўчай дзейнасці МУС Сяргей АЛЯШКЕВІЧ.** І прыводзіць у якасці прыкладу гісторыю 26-гадовага Аляксандра, які толькі што вызваліўся з месцаў пазбаўлення волі.

Аляксандр бадзяецца па турмах з 2007 года. Ён сірата. Калі вучыўся ў ПТВ, жыў у інтэрнаце. Потым здзейсніў злачынства, трапіў у турму, і з інтэрната яго выпісалі. Сацыяльную кватэру хлопец не атрымаў. Кажа, дакументы нейкія раней былі, але, пакуль хадзіў па турмах, ад іх нічога не засталося. Пашпарт ужо год як пратэрмінаваны...

Незадоўга да апошняй судзімасці Аляксандр пазнаёміўся з дзяўчынай з Браслава. Паехаў да яе, потым здзейсніў злачынства і сеў у турму. Пакуль сядзеў, вёў з гэтай дзяўчынай перапіску. Яна яму напісала: маўляў, пасля выхаду з турмы прыязджай жыць да мяне. Прыехаў, але ў першы ж дзень «адзначыў» сустрэчу, потым пасварыўся з новай сяброўкай і адлупцаваў яе. Дзяўчына выгнала яго. Пасля гэтага хлопец тры дні бадзяўся, начаваў у падвалах. Ні жылля, ні працы, ні якіх-небудзь сацыяльных сувязяў...

— Што ён еў? У лепшым выпадку нешта ўкраў, — мяркуе Сяргей Аляшкевіч. — Гэта значыць, зноў здзейсніў злачынства.

Куды яму звяртацца і як далей жыць, Аляксандр не ведаў. Кажа, ішоў па Мінску, убачыў надпіс «Міністэрства ўнутраных спраў» і наўздагад зайшоў. Так і трапіў у кабінет да Сяргея Аляшкевіча. Той дапамог хлопцу засяліцца ў Дом начнога знаходжання для асоб без пэўнага месца жыхарства. Гэтая ўстанова — месца, дзе можна пераначаваць. Таксама яго супрацоўнікі могуць дапамагчы аднавіць пашпарт, бясплатна прайсці медкамісію... Але, калі браць у цэлым, ніякай праграмы працы з гэтым былым асуджаным для яго далейшай адаптацыі ў грамадства сёння няма.

— Бывае, што, ледзь выйшаўшы на волю, чалавек учыняе забойства, і здараецца, што яго ахвярай становіцца не адзін чалавек, — адзначае Сяргей Аляшкевіч. — У такіх выпадках, калі мы пачынаем разбірацца, становіцца ясна, што лепш бы грамадства своечасова дапамагло былому асуджанаму з сацыяльнай рэабілітацыяй: знайшло жыллё, дапамагло ўладкавацца на працу — і ахвяр не было б, і падаткаплацельшчыкам не прыйшлося б утрымліваць чарговага злачынцу ў наступныя 15-20 гадоў.

### У ТРОХ БЕЛАРУСКІХ ПАПРАЎЧЫХ УСТАНОВАХ РЭАЛІЗУЕЦЦА НОВЫ ПРАЕКТ

«Вызваліўшыся, былыя зняволеныя адчуваюць сацыяльныя, псіхалагічныя, матэрыяльныя праблемы. Інтэграцыя іх у грамадства павінна скараціць у Беларусі колькасць злачынстваў», — падсумоўвае Сяргей Аляшкевіч.

Выпрацаваць алгарытм такой інтэграцыі і выбудаваць цэласную сістэму працы паставіў сваёй мэтай праект **«Інтэграцыя былых асуджаных у грамадства»,** які рэалізуецца Беларускім Чырвоным Крыжам у супрацоўніцтве з Міжнароднай федэрацыяй таварыстваў Чырвонага Крыжа і Чырвонага Паўмесяца і МУС Беларусі.

Гэты праект рэалізуецца ў папраўчай калоніі №15 і папраўчай установе № 44 у Магілёве, папраўчай калоніі №17 у Шклове і аддзелах унутраных спраў адміністрацый падведамасных раёнаў. У асноўным праца вядзецца з асобамі, якія ўпершыню ўчынілі злачынства невялікай цяжкасці. Яна пачынаецца за паўгода да вызвалення і прадугледжвае аднаўленне сямейных сувязяў, аказанне дапамогі ў прафарыентацыі і працаўладкаванні — і можа працягвацца да паўгода пасля іх вызвалення.

У сакавіку гэтага года ў рамках праекта была арганізавана навучальная паездка беларускіх спецыялістаў у Паўночную Ірландыю. Яны наведалі Брытанскі Чырвоны Крыж і няўрадавую арганізацыю — Асацыяцыю дапамогі і сацыяльнай рэабілітацыі асуджаных у Паўночнай Ірландыі, якая займаецца пытаннямі сацыялізацыі асуджаных ужо на працягу 45 гадоў.



Адбылася сустрэча з прадстаўнікамі органаў крымінальнай юстыцыі, ювенальнай юстыцыі і былымі асуджанымі.

Паўночная Ірландыя была абрана па прычыне рэформы крымінальна-выканаўчай сістэмы, якая адбываецца там. Да таго ж, па словах нашых супрацоўнікаў МУС, у Паўночнай Ірландыі, як і ў нашай краіне, актуальнай застаецца праблема рэцыдыўнай злачыннасці. Найбольш важным фактарам, які аказвае ўплыў на яе зніжэнне, ірландцы лічаць сістэматычную, мэтанакіраваную працу з сем'ямі, і асабліва з дзецьмі асуджаных.

— Даследаванні паказалі, што ў 70% асуджаных, якія адбываюць пакаранне, іх бацькі таксама прыцягваліся да крымінальнай адказнасці. Дзеці часта «заражаюцца» крымінальным вопытам, «рамантыкай» злачыннага жыцця, — згодны з ірландскімі спецыялістамі **намеснік начальніка ўпраўлення па арганізацыі папраўчага працэсу Дэпартамента выканання пакаранняў Аляксандр КРАЛЬКО.**

Аляксандр Кралько распавёў, што ў Паўночнай Ірландыі асноўная задача адміністрацыі турмы заключаецца не ў ахове зняволеных (гэтую функцыю выконвае электронная сістэма маніторынгу), а ў максімальнай дапамозе па іх рэабілітацыі. З гэтай мэтай, напрыклад, у турме Магхаберы ўжо амаль 1,5 года рэалізуецца эксперыментальная праграма па зніжэнні рэцыдыву праз уздзеянне на «міжпакаленчы эфект». Асуджаным — удзельнікам праграмы прадастаўлена магчымасць сустракацца са сваімі дзецьмі часцей, чым гэта прадугледжана законам (у спецыяльна абсталяваных памяшканнях дапамагаць сваім дзецям рабіць урокі, гатаваць разам абеды, бавіць час пры дапамозе развіваючых гульняў...) Падобную мадэль працы з асуджанымі ўжо выкарыстоўваюць у Нарвегіі і Даніі.

У нашай краіне вопыт работы з асуджанымі, якія будзе напрацаваны ў папраўчай калоніі №15, папраўчай установе №44 у Магілёве і папраўчай калоніі №17 у Шклове, плануецца ў далейшым прымяніць і ў іншых рэгіёнах краіны.

**Святлана БУСЬКО** ■

ДАРЭЧЫ

### УЛАДКАВАЦЦА НА ПРАЦУ СТАНЕ ПРАСЦЕЙ

**У Беларусі наймальнікаў стымулююць да прыёму на працу грамадзян, вызваленых з папраўчых устаноў.**

Пастановай Савета Міністраў ад 14 красавіка 2014 №347 зацверджана палажэнне аб парадку арганізацыі і фінансавання мерапрыемстваў па працаўладкаванні грамадзян, вызваленых з папраўчых устаноў. У ім змяшчаюцца меры, якія стымулююць наймальнікаў да прыёму на працу былых асуджаных, у прыватнасці, частковая кампенсацыя выдаткаў па аплаце працы такіх асоб.

Кампенсацыя выдаткаў будзе ажыццяўляцца на працягу 12 месяцаў з даты працаўладкавання грамадзян, вызваленых з папраўчых устаноў і прынятых на працу па накіраванні органаў па працы, занятасці і сацыяльнай абароне.

Кампенсуюцца выдаткі наймальнікаў на выплату заработнай платы такім работнікам з улікам адпрацаванага часу ў памеры, які не перавышае мінімальную заработную плату (з 1 студзеня 2014 года складае 1млн 660 тыс. рублёў), а таксама сума абавязковых страхавых узносаў.

Камітэт па працы, занятасці і сацабароне Мінгарвыканкама, упраўленні (аддзелы) па працы, занятасці і сацабароне гарадскіх і раённых выканкамаў будуць устанаўліваць наймальнікам бронь для прыёму былых асуджаных на працу; садзейнічаць у пошуку зручнай працы; прадастаўляць паслугі па прафесійнай арыентацыі; накіроўваць на прафпадрыхтоўку, перападрыхтоўку і павышэнне кваліфікацыі; садзейнічаць у арганізацыі прадпрымальніцкай дзейнасці, дзейнасці па аказанні паслуг у сферы аграэкатурызму, рамеснай дзейнасці; фінансаваць наймальнікаў (арганізацыі любых арганізацыйна-прававых формаў і індывідуальных прадпрымальнікаў) шляхам частковай кампенсацыі выдаткаў па аплаце працы грамадзян, якія выйшлі з месцаў пазбаўлення волі.

Пастанова ўступіла ў сілу 16 красавіка гэтага года.

## Цэнтры ўсё скаардынуюць

**На чыгуначных вакзалах у Мінску і Брэсце пачалі работу кругласутачныя каардынацыйныя цэнтры.**

На вакзалах станцый Мінск-Пасажырскі і Брэст-Цэнтральны яны будуць працаваць да заканчэння чэмпіянату свету па хакеі. Галоўнымі задачамі цэнтраў з'яўляецца пастаянны маніторынг дзейнасці ўсіх падраздзяленняў вакзальнага комплексу, а таксама арганізацыя іх узаемадзеяння пры ўзнікненні нестандартных сітуацый. На станцыі Мінск-Пасажырскі каардынацыйны цэнтр размясціўся на першым паверсе вакзала.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**


# РУП «Институт недвижимости и оценки»

► **ОЦЕНКА ИМУЩЕСТВА**
(недвижимость, транспорт, оборудование, бизнес, интеллектуальная собственность)

► **ОРГАНИЗАЦИЯ И ПРОВЕДЕНИЕ АУКЦИОНОВ**

**РУП «Институт недвижимости и оценки» (Организатор аукциона) извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже**
**здания административно-хозяйственного**
**с инв. № 500/С-10550,**
**принадлежащего ОАО «Оптоэлектронные системы» (Продавец) и расположенного по адресу: г. Минск, ул. Черняховского, д.1.**

Часть здания с инв. № 500/С-10550 сдается в аренду: 19,3 $м^2$ по 31.05.2014; 21,8 $м^2$ по 31.12.2015; 23,4 $м^2$ по 31.12.2015; 28,3 $м^2$ по 31.12.2015; 63 $м^2$ по 31.12.2015; 19 $м^2$ по 31.12.2015; 79,9 $м^2$ по 31.05.2014; 31,3 $м^2$ по 31.12.2015; 58 $м^2$ по 31.12.2016; 80,6 $м^2$ по 31.05.2014; 30,1 $м^2$ по 30.04.2014; 38,7 $м^2$ по 31.12.2015; 10,1 $м^2$ по 31.01.2016; 22 $м^2$ по 31.05.2016.

Для эксплуатации и обслуживания здания административно-хозяйственного ОАО «Оптоэлектронные системы» предоставлен в аренду по 28.02.2015 земельный участок площадью 0,1226 га с кадастровым номером 500000000009005284 с ограничением прав на земельные участки, расположенные: в охранной зоне линий связи и радиофикации, площадь 0,0184 га; охранной зоне линий электропередачи, площадь 0,0055 га; охранной зоне сетей и сооружений газоснабжения, площадь 0,0040 га.

**Начальная цена с НДС – 7 920 960 000 бел. руб.**
**Задаток с НДС – 396 048 000 бел. руб.**

*Задаток перечисляется на р/с № 3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк» ЦБУ №703, 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, код 369. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в повторном аукционе по продаже имущества ОАО «Оптоэлектронные системы»,* **проводимом 30 мая 2014 г.**

Договор купли-продажи должен быть заключен в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона. Оплата за Объект осуществляется в срок, который будет установлен в договоре купли-продажи Объекта между Победителем аукциона (Претендентом на покупку) и Продавцом.

**Аукцион состоится 30.05.2014 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 4. Шаг аукциона – 5%. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 28.05.2014 до 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 2.**

*Первое полное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 12.02.2014.*

С полным текстом извещения можно ознакомиться на сайте Организатора аукциона **ino.by.**

☎ **Дополнительная информация: 8 (017) 306-00-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: 5538325@mail.ru**



# ИЗМЕНЕНИЯ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ

**по объекту «Многоквартирные жилые дома со встроенно-пристроенными помещениями общественного назначения и подземной гараж-стоянкой на 100 машино-мест в границах ул. Червякова, Каховской, Сморговского тракта» 1-я очередь строительства – жилой дом № 1 по генплану», *опубликованную в газете «Звязда» 01 апреля 2014 года:***

**Застройщик**: Общество с ограниченной ответственностью «Фармоэкспотех», зарегистрировано Минским горисполкомом решением от 22 ноября 2007 г. № 2720 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 101472333.

Юридический и почтовый адрес: Республика Беларусь, 220053, г. Минск, переулок Червякова, дом 21А, пом. 5, каб. 3

**Тел.: 8 (017) 216 00 09, 8 (029) 654 10 10, 8 (029) 708 46 64.**

Режим работы по вопросам долевого строительства: понедельник – пятница с 9.00 до 17.00, обед с 13.00 до 14.00, выходные дни – суббота, воскресенье.

Для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства предлагаются помещения торгово-общественного назначения в цокольном этаже и на 1 этаже общей площадью от 58 $м^2$ до 107 $м^2$.

Стоимость 1 $м^2$ помещений, расположенных на 1 этаже, при условии 100% единовременной оплаты 1900 долларов США, при оплате в рассрочку 2000 долларов США.

*Стоимость 1 $м^2$ помещений, расположенных в цокольном этаже, 1850 долларов США.*

УНП 101472333


■ Запрашальнік

# ДАРЭВАЛЮЦЫЙНАЯ ТРАДЫЦЫЯ: СІМФОНІІ... НА ВУЛІЦЫ

**У Віцебску, як у паслярэвалюцыйныя гады, зноў загучыць сімфанічная музыка на вуліцы. Такім чынам будзе працягнута незвычайная традыцыя.**

Напэўна, мала хто ведае, што ў 1919-1921 гадах ў правінцыйным горадзе над Заходняй Дзвіной сімфоніі выконвалі на адкрытым паветры. Было гэта ў перыяд існавання гарадскога сімфанічнага аркестра пад кіраўніцтвам Мікалая Малько. Мікалай Андрэевіч вучыўся па класах кампазіцыі ў Мікалая Рымскага-Корсакава, Анатоля Лядава і Аляксандра Глазунова. Ён кіраваў рознымі аркестрамі, у тым ліку Ленінградскім філарманічным. У 1925 годзе аркестр пад яго кіраўніцтвам упершыню выканаў першую сімфонію Дз. Шастаковіча. Праз чатыры гады дырыжор пакінуў СССР. Працаваў у якасці запрошанага дырыжора ў Вене, Празе, Капенгагене, Лондане і іншых гарадах. Потым кіраваў сімфанічным аркестрам Сіднея, з якім у 1959 гастраляваў у СССР.

— Традыцыя даваць сімфанічныя канцэрты на вуліцы адноўлена ў сувязі з 25-годдзем Віцебскай абласной філармоніі. Вечарам 25 мая ва ўнутраным дворыку адбудзецца вечар сімфанічнай музыкі OPEN AIR (на адкрытым паветры. — **Аўт.**). Выступіць сімфанічны аркестр філармоніі. Мастацкі кіраўнік і галоўны дырыжор — Уладзімір Бяляўскі. Кошт квітка — 50 тысяч рублёў, — паведамілі карэспандэнту «Звязды» ва ўстанове культуры.

Падчас святкавання юбілею таксама пройдуць вечары вакальнай, камернай музыкі і нацыянальнага мастацтва. У прыватнасці, адбудзецца канцэрт ансамбля танца, музыкі і песні «Талака», прысвечаны 20-годдзю калектыву. А падчас вечара камернай музыкі з творчай справаздачай «40 гадоў на сцэне» выступіць лаўрэат міжнародных конкурсаў і фестываляў актэт балалаек «Віцебскія віртуозы».

29 мая адбудзецца гала-канцэрт закрыцця XXV канцэртнага сезона з удзелам артыстаў і калектываў філармоніі.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## «Добрае сэрца Міншчыны» — дзецям

**Дзень дабра пройдзе ў Слуцку 17 мая. Мерапрыемства ладзіцца ў межах праекта «Добрае сэрца Міншчыны» і валанцёрскага руху Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі.**

Маладыя людзі акажуць дапамогу ўдзельнікам Вялікай Айчыннай вайны, адзінокім і адзінока пражываючым пажылым людзям, сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей-інвалідаў. Акрамя таго, яны запішуць успаміны ветэранаў. А валанцёрскі атрад прафесіянальна-тэхнічнага каледжа перапрацоўчай прамысловасці будзе добраўпарадкаваць тэрыторыю Слуцкага раённага цэнтра карэкцыйна-развіваючага навучання. Пасля работы яны і інваліды-калясачнікі сустрэнуцца з артыстамі прадзюсарскага цэнтра «Спамаш» Іванам Буслаем і Дарыяй.

На працягу дня ў гарадскім Доме культуры і на прылеглай да яго тэрыторыі пройдзе дабрачынны кірмаш, дзе будуць выстаўлены вырабы, сувеніры, малюнкі, створаныя ўдзельнікамі БРСМ. Частку сабраных сродкаў накіруюць дзецям-інвалідам.

Кульмінацыяй свята стане дабрачынны марафон нон-стоп «Усе фарбы жыцця для цябе». У канцэрце прымуць удзел фіналіст праекта «Голас-2» Пётр Ялфімаў, групы «Atlantica», «Cherry Lady», Іван Буслай, Дарыя, Марыя Лютая, спецыяльны госць з Польшчы Надзея Бронскі.

Выручка ад продажу білетаў пойдзе на набыццё неабходных рэчаў для карэкцыйна- развіваючага цэнтра. У прыватнасці, інтэрактыўнай дошкі для дзяцей з парушэннямі функцый апорна-рухальнага апарату, спецыялізаванага сенсорнага абсталявання для выхаванцаў з цяжкімі і множнымі парушэннямі ў развіцці.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

## МУЗЫ Ў НЯСВІЖЫ

**Старажытны і такі малады Нясвіж зноў прымае свята мастацтваў «Музы Нясвіжа — 2014», 19-е па ліку. На працягу трох дзён, з 22 па 24 мая, госці змогуць наведаць спектакль «Гэта таго каштуе» М. Каляды, дзве мастацкія выставы, а таксама прыняць удзел у прэзентацыі новай кнігі «Мастацкія цуды Нясвіжскай зямлі» і ў навукова-практычнай канферэнцыі «Беларуская думка ў пошуку новых вымярэнняў». У ёй возьмуць удзел вядомыя даследчыкі беларускага мастацтва.**

Упрыгожаннем свята стануць канцэрты Нацыянальнага акадэмічнага канцэртнага аркестра Беларусі і яго камерных калектываў. У іх выкананні прагучаць творы выдатных айчынных майстроў, што працавалі пры двары Радзівілаў шмат стагоддзяў таму, а таксама музыка саміх колішніх уладароў Нясвіжа. Сімвалічна, што канцэрты старадаўняй айчыннай музыкі адбудуцца менавіта ў асяроддзі, дзе калісьці тая музыка і нараджалася: у Радзівілаўскім палацы і мясцовай ратушы. Мастком, які яднае розныя эпохі, стане канцэрт, прысвечаны юбілею першай беларускай оперы «Агатка». Яна, дарэчы, створана і пастаўлена ў Нясвіжы 230 гадоў таму. Таксама знакаміты аркестр парадуе сваіх прыхільнікаў спецыяльна падрыхтаванай маладзёжнай праграмай, у якой прагучаць любімыя песні ды эстрадныя мелодыі.

Традыцыйна «Музы Нясвіжа» праводзяцца пры дзейснай падтрымцы Мінскага абласнога і Нясвіжскага раённага выканаўчых камітэтаў.

**Таццяна ГЕОРГІЕВА.**

## У дружным родзе — усё ў згодзе

**Сорак сямейных калектываў з 20 рэгіёнаў Міншчыны прымуць удзел у V абласным фестывалі «У добрым родзе — усё ў згодзе», што адбудзецца ў Салігорску 24 мая. Яны прадэманструюць усю шматграннасць жанраў аматарскага мастацтва і дэкаратыўна-прыкладной творчасці.**

У парку «Чатырох стыхій» адбудзецца выстава работ дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва і пекарскага майстэрства «Сям'я майстрамі славіцца».

На галоўнай сцэнічнай пляцоўцы горада ладзіцца тэатралізаванае дзейства «Увесь мой род гуляе» з удзелам 22 сямейных аматарскіх калектываў. Сярод іх як маладыя сем'і, так і сямейныя творчыя дынастыі. Гэта народны калектыў «Радзіна» Новінскага сельскага дома культуры Бярэзінскага раёна, народны ансамбль сям'і Бойкаў Гаўрыльчыцкага сельскага дома культуры Салігорскага раёна, народны сямейны ансамбль «Суседзі» Дзяржынскага гарадскога дома культуры, творчыя калектывы сям'і Карнішкаў з вёскі Антопаль Мінскага раёна і сям'і Лямбовіч-Палуйчыкаў з пасёлка Ракаў Валожынскага раёна і іншыя.

Па традыцыі членамі журы фестывалю будуць творчыя сямейныя пары, у тым ліку рэжысёр народнага тэатра Бярэзінскага дома культуры Мікалай Пытляк са сваёй вернай спадарожніцай Валянцінай Анатольеўнай, якая працуе ў гэтым жа тэатры.

Падчас свята пройдзе пленэр юных мастакоў, выхаванцаў дзіцячай мастацкай школы г. Салігорска, «Вясна ў маім горадзе», канцэртная праграма «Мары дзяцінства», танцавальны вечар «Адпачываем усёй сям'ёй».

Фестываль праводзіцца з 1998 года. Яго мэта — падтрымка і папулярызацыя сямейнай мастацкай творчасці, захаванне і пераемнасць нацыянальных сямейных традыцый, умацаванне прэстыжу сям'і ў грамадстве.

**Таццяна ЛАЗУРНАЯ.**


# ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

## ОАО «Торфобрикетный завод Дитва»

## ПРОВОДИТ ПОВТОРНЫЙ АУКЦИОН ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТА НЕДВИЖИМОСТИ

| | |
|---|---|
| **Наименование объекта, краткая характеристика** | **Капитальное строение — здание полевой производственной базы с инвентарным номером № 420/С-47514, пл. 369,7 кв.м, назначение — здание специализированное сельскохозяйственного назначения. Расположено по адресу: Гродненская обл., Лидский р-н, Дитвянский с/с, 1, в р-не д. Ворнишки** |
| **Земельный участок** | Кадастровый № 423683200048000001. Площадь земельного участка 0,0631 |
| **Начальная цена** | 17 578 275 (семнадцать миллионов пятьсот семьдесят восемь тысяч двести семьдесят пять) белорусских рублей с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 1 758 000 (один миллион семьсот пятьдесят восемь тысяч) белорусских рублей |
| **Условия оплаты** | По договоренности сторон |
| **Срок заключения договора** | Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | р/с 3012266310018 в отд. № 228 г. Лида, ОАО «Белинвестбанк», МФО 153001739, УНП 500051993, ОКПО 029990314000 |

**Повторный аукцион состоится 26 мая 2014 г. в 14.00** по адресу: Гродненская область, Лидский район, агрогородок Дитва, ул. Первомайская, 3.

**Заявления принимаются до 16.00 22 мая 2014 г.** по адресу: Гродненская область, Лидский район, а/г Дитва, ул. Первомайская, 3. Телефон для справок: ОАО «Торфобрикетный завод Дитва» тел. 8-0154-577-650 с 8.30 до 16.30.

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Для участия в аукционе подается заявление на участие в аукцион, заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении, копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица.

■ Неасабісты суб'ектыў

# ЧАС ЛЮБІЦЬ

## Сучасны свет ратуе не прыгажосць



Рыхтуючы да друку майскі нумар часопіса «Родная прырода», мы нават не сумняваліся, чыё фота павінна быць на вокладцы. Безумоўна, зубра — сімвала нашай краіны, а цяпер яшчэ і талісмана хакейнага сусветнага першынства, якое Беларусь у маі прымае. Фота наш майстар Анатоль Кляшчук прапанаваў дзясяткі з тры, але адно было па-за канкурэнцыяй. Зубрыха з цяляткам. Яно яе цалуе ў мысу, а мамка плюшчыць вочы ад задавальнення. Абое такія чысценькія, шарсцінка да шарсцінкі, нібы спецыяльна да «фотасесіі» нейкі пушчанскі стыліст іх памыў і прычасаў... І тыя два-тры словы, абавязковыя для вокладкі, своеасаблівы загаловак нумара, прыдумаліся і напісаліся самі сабой — «Час любіць». Як эпіграф для самага шыкоўнага месяца года, а калі трохі задумацца — дык і да ўсяго нашага жыцця.

Той фотаздымак убачылі ці не ўсе калегі па рэдакцыі — хто заходзіў у кабінет, тым абавязкова на экране камп'ютара паказвала: ну проста карцела падзяліцца гэтай цеплынёй і замілаваннем. І ў кожнага на твары з'яўлялася шчырая дзіцячая ўсмешка, нават у самых заклапочаных сваімі думкамі і справамі...

Наогул, з таго часу, як стала займацца «Родная прыродай», я, як гэта ні патэтычна гучыць, пачала больш верыць людзям і ў людзей. Бо амаль штодня пачала завочна ці асабіста сустракацца з тымі, для каго час любіць настаў ужо даўно, не патрабуе ніякіх аргументаў і не выклікае ніякіх сумненняў.

Нядаўна ў вёсцы Навасады, што пад Дзяржынскам, работнікі мясцовага сельгаспрадпрыемства наводзілі парадак на старой ферме. Сталі выкідваць старыя разбітыя бетонныя пліты, а пад адной з іх — гняздо. А ў ім — сляпыя яшчэ звяркі: ці то шчаняты, ці то яноты, ці то лісяняты. Маленькія жаласна скуголілі, тыкалі пыскамі ў паветра, нібы адчуваючы, што магчымая пагібель блізка і што маці на дапамогу не прыйдзе... Але малады трактарыст сабраў усіх пяцярых у сваю куртку (і паспрабуйце цяпер пафіласофстваваць пра жорсткую вёску, дзе ледзь не кожны мужчына не міргнуўшы вокам можа павесіць сабаку ці забіць ката), паклаў у кабіну трактара і павёз да старасты вёскі, цёткі Лёлі, Леаніды Сцяпанаўны Шышкавец. Ведаў: тая не пакіне сірот у бядзе.

Звяркоў, якія насамрэч аказаліся лісянятамі, Леаніда Сцяпанаўна выхадзіла-такі. Карміла малаком з піпеткі, пасля пачала падмешваць туды яйка. Варыла ім макарону-павуцінку, вучыла есці са сподачка. Гадаванцы ўжо і вочы адкрылі, па двары жвава рухацца пачалі. Пяць лісаў на падворку — уяўляеце, якая «выдатная» перспектыва для сваіх ды суседскіх курэй? «Але ж не кінеш — жывое», — проста і без іншых варыянтаў тлумачыць свой клопат аб малых драпежніках жанчына.

Зрэшты, у лісянят лёс склаўся шчасліва — ім пашанцавала на добрых людзей. Побач, у Станькаве, — цэнтр экатурызму, дзе ёсць свой заасад, там ужо нямала такіх сірот. Напрыклад, летась прывезлі маленькае, з рукавічку, медзведзяня, якое маці па невядомых прычынах кінула адно на сцежцы ў Бярэзінскім запаведніку. Цяпер мядзведзіца Васіліса — любіміца наведвальнікаў. Навасадскіх лісянят прынялі гасцінна. Нават новая мама ў іх знайшлася — чорная кошка Аліса, якая іх корміць, вылізвае, гуляе з імі...

Вы не заўважалі дзіўную рэч: калі чытаеш падобныя гісторыі ці глядзіш па тэлебачанні кадры, на якіх людзі цягнуць з ледзяной палонкі ліся, лечаць пакалечаных птушак, знаходзяць прытулак кінутым шчанятам і кацянятам, вочы становяцца вільготнымі, а ў грудзях разліваецца цеплыня і мякка сціскаецца сэрца? Можа, таму, што мы ў такіх гісторыях, на гэтых кадрах бачым саміх сябе — такіх, якімі мы можам быць, такіх, якімі нас стварылі нябёсы з самага пачатку, такіх, за якіх не соромна ні перад сабой, ні перад светам...

Магчыма, у часы Дастаеўскага свет яшчэ сапраўды магла выратаваць прыгажосць (хаця гэтая растыражаваная цытата, вырваная з кантэксту, насамрэч мае на ўвазе нашмат больш, чым мы, калі згадваем яе да месца і не да месца). Наш шалёны свет, які з касмічнай хуткасцю нясецца ў прасторы, ад самазнішчэння ратуюць простыя і вечныя дабрыня, спагада і любоў. І пакуль яны ёсць, у нашага блакітнага шарыка яшчэ застаюцца шанцы выжыць.

...Кожнае лета, калі пачынаюць спець парэчкі і вішні, на вясковыя падворкі пачынаецца сапраўднае нашэсце драздоў. Шэрыя крылатыя нахабнікі аб'ядаюць чырвоныя ягады дазвання, пакідаючы на кустах абабраныя кісці, а пад дрэвамі — россып костачак. Сёе-тое застаецца і нам, але ж нахабства якое! А сёлета яны вырашылі звіць гняздо проста «ў сталоўцы» — на вішні. Згледзелі мы тое адразу, але збіць — рука не паднялася: «жывое ж». Аднавяскоўцы спачатку кпілі і не разумелі: маўляў, навошта вам пражэрлівыя птушкі ў садзе, застанецеся без кампотаў і без варэння... А пасля... Каб вы бачылі, з якім клопатам дрозд корміць «жонку», якая сядзіць на яйках, як рупліва яны ўдваіх папраўляюць гняздо! Кабеты, што ідуць міма ў краму, спыняюцца, абмяркоўваюць — бы сапраўдны спектакль ці серыял глядзяць. І нават вечна п'янаваты дзяцюк, няцвёрдай хадою вяртаючыся дадому, кожны раз спыняецца, з засяроджана-дзіцячым выразам на твары выцягвае шыю — цікавіцца, ці не вывеліся яшчэ птушаняты...

А вішні... Халера з імі, з вішнямі! Хай ядуць на здароўе.

**Алена ЛЯЎКОВІЧ**

# Майскія напевы

## Вясна, май у вершах беларускіх паэтаў




**Па гарызанталі:** **1.** «Маразамі скутая вясна,\\Казачная, мілая ...». З верша В. Віткі «Пачатак вясны». **7.** «Ходзіць, як ..., па свеце\\Светлы і радасны май». З верша А. Астрэйкі «Сонца вясеннее свеціць». **8.** «У шлюбным вэлюме ....\\Шалеюць птушкі ад світання». З верша Н. Аксёнчык «О май — пара кахання». **11.** «Зелянеюць зноўку лазнякі,\\А ў вясеннім небе — ... птушыны». З верша М. Танка «Вырай». **13.** «Ты мне ...! І мора! І подых маю!». З верша У. Караткевіча «Маладая вясна». **14.** Вялікі сад з алеямі, кветкамі. **17.** Жаба ... падала — сей авёс *(прыкм.)*. **18.** Мужчынскае імя. **19.** «А за Мінскім морам у зацішку\\Сонца ўжо ... зялёны тчэ». З верша П. Панчанкі «Вясновыя матывы». **21.** ... на Марка (8 мая), дык зямля, як скварка (прык.). **22.** Рака, левы прыток Прыпяці. **23.** «... вам, салдаты,\\Што Перамогі дзень узнеслі датай\\Другога дня радзін не толькі мне». З верша А. Лойкі «... вам, салдаты!». **26.** Выраз твару. **29.** Свята багіні вясны Лялі, якое адзначалася 5 мая. **30.** «Цёплы майскі ... неба абдымае,\\За ракою вецер на цымбалах грае». З верша С. Брандта «Абдымкі майскага вечара». **31.** «Той май быў шчодры на дарункі:\\На цеплыню і на ...». З верша Э. Акуліна «Май».

**Па вертыкалі:** **2.** Контур. **3.** Палотнішча для паказу кінафільмаў. **4.** Празмерна, вельмі. **5.** «Хвалюючысь, мы нясем букеты:\\Пралескі, ландыш — ... вясны». З верша А. Грушэцкага «Вясна». **6.** «У ружовай постаці — над нівай\\Цвіце ...,\\Красы ...». З верша П. Труса «Май»; сёлета, у маі, спаўняецца 110 гадоў з дня нараджэння паэта. **9.** Свята вясны, якое адзначалі 10 мая ў гонар апекуна ўрадлівасці — бога Ярылы. **10.** «... ў квяцістай спадніцы,\\Вышываны падол — з дзьмухаўцоў». З верша Т. Дзям'янавай «О, вясна! О, вясна-чараўніца!». **12.** Вялікі кусок (разм.). **14.** «Ад зямлі ідзе ўжо ...,\\Будзе сеяць гаспадар». З верша А. Старынчыка «Пяе ветрык». **15.** З дурнога куста і ... пуста (прык.). **16.** Від цукерак. **20.** ... пераспаць — не век векаваць *(прык.)*. **21.** «А зіма, як ..., прапала! Зеляне луг, ралля». З верша Я. Коласа «Вясна». **23.** «Будзеш, май, сваё святкаваць ...». З верша Я. Купалы «З першым маем». **24.** Першая літара грэчаскага алфавіта. **25.** Усё воднае покрыва Зямлі. **27.** «Наша ... — бярозавік весні,\\Аксаміт жаўруковае песні». З верша Я. Золака «Наша ...». **28.** Бывае ..., што коням сена дай, а сам на печ уцякай (прык.).

**Склаў Лявон ЦЕЛЕШ.**

*г. Дзяржынск.*

**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ**

**Па гарызанталі:** 1. Царэўна. 7. Казка. 8. Прырода. 11. Крык. 13. Сонца. 14. Парк. 17. Голас. 18. Рыгор. 19. Дыван. 21. Дождж. 22. Пціч. 23. Слава. 26. Міна. 29. Ляльнік. 30. Вечар. 31. Каханне.

**Па вертыкалі:** 2. Абрыс. 3. Экран. 4. Надта. 5. Пах. 6. Зара. 9. Ярылавіца. 10. Прыгажуня. 12. Кус. 14. Пар. 15. Ягада. 16. Дража. 20. Ноч. 21. Дым. 23. Свята. 24. Альфа. 25. Акіян. 27. Мова. 28. Май.

■ На свае вочы

# ХУТКАСЦІ НЕ СКІДВАЙ НА ВІРАЖАХ...



**У аграгарадку Тулава Віцебскага раёна адбыліся аўтагонкі з удзелам каля 60 беларускіх і расійскіх спартсменаў. Тут пачаўся першы этап чэмпіянату Беларусі па аўтамабільным кросе. Сярод гоншчыкаў былі і асы з Масквы і Смаленскай вобласці. Удзел іншаземцаў у беларускім аўтамабільным кросе тлумачыцца проста: яны выступаюць за нашы каманды.**

Сотні гараджан і гасцей Віцебска сталі сведкамі прыгожых і захапляльных спаборніцтваў. І, безумоўна, небяспечных (У гэтым мы ўпэўніліся, калі ўбачылі, што адно з гоначных аўто загарэлася пасля таго, як спартсмен праехаў некалькі кругоў.)

— Спаборніцтвы тут праводзяцца ўжо дзясяткі гадоў. Насамрэч гэтая траса — унікальная: бяспечная, але цяжкая. Вядома, спадзяёмся пашырыць геаграфію ўдзельнікаў: і прыбалтаў запрашаем, і ўкраінцаў рады будзем бачыць. І хацелася б, каб расіян сярод удзельнікаў было больш. Вось сёлета масквічы прыехалі — ім спадабаўся рэльеф мясцовасці, — расказаў карэспандэнту «Звязды» **Васіль КОРАБАЎ, старшыня Віцебскай абласной арганізацыйнай структуры ДТСААФ.**

Мацнейшых вызначалі ў пяці класах аўто (у залежнасці ад магутнасці рухавіка. — **Аўт.).**

— Гэтая траса больш вядомая таму, што тут праводзіліся мотакросы: памяці Героя Савецкага Саюза Міная Шмырова, чэмпіянат СССР. А падчас Кубка дружбы сацыялістычных краін змагаліся за перамогу венгры, палякі, чэхі і нават кубінцы, — патлумачыў **Мікалай ВЯЛЮГА, суддзя нацыянальнай катэгорыі. —** Тут паказвалі выдатную язду чэмпіён свету Генадзь Майсееў, трохразовы сярэбраны прызёр чэмпіянату свету Уладзімір Кавінаў, чэмпіён свету Віктар Арбекаў. Ганяў тут і легенда беларускага спорту Леў Варановіч, заслужаны трэнер Беларусі і заслужаны дзеяч фізічнай культуры і спорту Беларусі...



Калісьці тысячы гледачоў назіралі за барацьбой гоншчыкаў. Але прыйшоў час, калі спаборніцтвы сталі праводзіцца толькі на энтузіязме. Пасля развалу СССР па зразумелых прычынах арганізатары сутыкнуліся з шэрагам цяжкасцяў. Аднак дзякуючы энтузіястам гэтага віду спорту мотакросы праводзіліся да канца 1990-х гадоў. (Такіх людзей называюць людзьмі з «бензінам у крыві».). Цяпер у Віцебску ёсць аўтасекцыя, а мотасекцыі — няма. Між тым, мотаспортам можна займацца, пачынаючы з 5-6 гадовага ўзросту, а аўтаспортам — з гадоў 12-14. На Віцебшчыне, дарэчы, ёсць цэлыя дынастыі гоншчыкаў.

— Некалькі гадоў таму віцебскі ДТСААФ вырашыў адрадзіць спаборніцтвы па мотакросе, пры падтрымцы мясцовай улады і дзякуючы невычэрпнай любові да гэтага віду спорту яго гарачых прыхільнікаў і ветэранаў, — сказаў Васіль Корабаў.

У чытачоў нашай газеты ёсць шанц 17 мая атрымаць асалоду ад выступленняў мотакрасменаў. Прыемных уражанняў хопіць надоўга.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
**Фота Віктара НІКАЛАЕВА**




**Ім неабходна знайсці «залатую» сярэдзіну паміж праяўленнем свайго нястрыманага нораву і захаваннем якой-небудзь стабільнасці. Яны могуць ствараць уражанне ўраўнаважаных асоб, а на самой справе многія з іх ліслівыя і ўгодлівыя. Калі ім удаецца накіраваць сваю энергію ў творчае рэчышча, яны здольныя дасягнуць ашаламляльных вынікаў. Самагубныя імкненні, дэпрэсіі, маніякальныя бачанні — усё магчыма ў іх унутраным свеце. Своечасовая падтрымка з боку любімых людзей мае вельмі важнае значэнне для тых, хто нарадзіўся ў гэты дзень. Калі ў іх радасны настрой — знаходзіцца побач з імі адно задавальненне. Большасць з іх любіць эпатаж. Вялікае значэнне для іх мае адзенне, колер, і ад таго, як яны апрануты, у пэўнай ступені залежыць іх настрой.**

Даты | Падзеі | Людзі

**1686** год — быў падпісаны «Вечны мір» паміж Расіяй і Рэччу Паспалітай. Гэта азнаменавала новы этап у адносінах паміж дзвюма дзяржавамі. Нарэшце скончылася 32-гадовая вайна за тэрыторыі сучасных Украіны і Беларусі. Паводле дагавора, левабярэжжа з Кіевам, Запарожжа і Смаленск замацаваліся за Расіяй. Правабярэжная Украіна засталася ў складзе Рэчы Паспалітай. Аднак яе ўрад абавязаны быў праяўляць клопат пра інтарэсы свайго праваслаўнага насельніцтва. З часам «Вечны мір» лёг у аснову руска-польскага саюза ў Паўночнай вайне супраць Швецыі 1700—1721 гадоў. Падпісанне мірнага пагаднення адкрыла магчымасць для аб'яднання краін супраць яшчэ аднаго агульнага ворага — Асманскай імперыі.

**1718** год — нарадзілася (Наваградчына) Саламея Рэгіяна Іахімаўна Русецкая, беларуская мемуарыстка, асветніца. У 14 гадоў прыбыла ў Стамбул, дзе вывучала спосабы і сродкі лячэння розных хвароб. У 1739-м вярнулася на радзіму, вяла медыцынскую практыку ў Нясвіжы. У 1760 годзе наведала Святую зямлю. Аўтар мемуараў на польскай мове «Пададзенае свету рэха заняткаў, падарожжа і жыцця майго авантур...», дзе паказала побыт і розныя бакі жыцця тагачаснай Беларусі. Гэта творы-ўспаміны і разважанні пра падзеі таго часу, замалёўкі-партрэты людзей, якіх яна сустракала падчас падарожжаў па краінах Захаду і Усходу, метады лячэння розных хвароб. Яна была першай на беларускіх землях жанчынай, якая афіцыйна займалася медыцынай. Спачатку лячыла хваробы вачэй, а потым і іншыя захворванні. Займалася лячэннем пры дварах рускай імператрыцы Ганны Іаанаўны, аўстрыйскага імператара, князёў Радзівілаў. Некаторы час практыкавала ў Вене, лячыла членаў турэцкага пасольства. Памерла пасля 1760 года.




**1889** год — 125 гадоў таму ў газеце «Минский листок» упершыню апублікаваны тэкст выдатнага помніка беларускай літаратуры — ананімнай беларускамоўнай паэмы «Тарас на Парнасе», якая дагэтуль распаўсюджвалася толькі ў рукапісным выглядзе.

## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 5.06 | 21.07 | 16.01 |
| Віцебск — | 4.49 | 21.03 | 16.14 |
| Магілёў — | 4.56 | 20.57 | 16.01 |
| Гомель — | 4.49 | 20.47 | 15.58 |
| Гродна — | 5.22 | 21.21 | 15.59 |
| Брэст — | 5.30 | 21.15 | 15.45 |

### Месяц

***Поўня 14 мая.***
***Месяц у сузор'і Стральца.***

### Імяніны

***Пр.*** *Мікалая, Пятра, Цімафея.*
***К.*** *Андрэя, Венчыслава, Сымона.*



Фота Алесі ВАРАБ'ЁВАЙ.

## ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

**Каб улетку добра выглядаць на пляжы, Люся яшчэ з зімы пачала адкормліваць сваю лепшую сяброўку Аксану.**

У салоне прыгажосці.

— Мне манікюр, калі ласка, як у Брытні Спірс, макіяж, як у Анжаліны Джолі, прычоску, як у Наомі Кэмпбэл...

— А твар Жэрара Дэпардзье пакідаем?

**Згодна з вынікамі сацапытання, праведзенага ў інтэрнэце, на пытанне «Ці будзеце вы трэцім?..» 100% рэспандэнтаў адказалі «Так», не дачытаўшы пытанне да канца. 66% папрасілі ўдакладніць месца, дату і час. 34% згодны быць трэцім толькі па пятніцах.**

У супермаркеце вельмі эканомная пакупніца так доўга выбірала пельмені, што абмарозіла сабе твар і рукі.



caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 21.143. Індэкс 63850. Зак. № 2002.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 15 мая 2014 года.